253. МОСКВА 19.
УЛ. ФРУНЗЕ, 10 ИНСТИТУТ
СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА
1. 1.12.36

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 103 (5477)
ПЯТНІЦА
8
МАЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР — АБ НАДАННІ НОВАМУ АРШАНСКАМУ АЭРАКЛУБУ ІМЯ Н. Ф. ГІКАЛО.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — ЦВЁРДЫМ ПОСТУПАМ — ДА НОВЫХ ВЫШЫНЬ!

АГЛЯД ДРУКУ — ВЫНІКІ ПАЛІТЫЧНАЙ СЛЕПАТЫ РЭДАКТАРА.

Г. РУБІНШТЭЙН — ВОПЫТ ВЫХАВАННЯ АДСТАЮЧЫХ КОМУНІСТАЎ.

Р. ФРАЛОЎ — СПАБОРНІЦТВА БАЦЬКІ З СЫНАМ.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ — ГРУБАЕ ПАРУШЭННЕ ЎНУТРЫПАРТЫЙНАЙ ДЭМАКРАТЫІ.

Е. П. ВІЛЕТНІКАВА — У СЕЛЕКТАРА.

А. П. ЕГОРАЎ — БУДУ ЗМАГАЦЦА ЗА ЎЗОРНАЕ ДЭПО.

Л. Л. БАЙКАЧОЎ — ДЗЯКУЙ СТАЛІНУ.

А. Ф. БАРОЎСКАЯ — ПРАЦУЮ З КОЖНЫМ ЧАЛАВЕКАМ.

А. НІКІЦІН — ЗА 10 ТЫСЯЧ КІЛОМЕТРАЎ БЕЗ ПРАМЫЎКІ.

ЗА РУБЯЖОМ:
«ПЕРАМОГА» НАД БЯЗЗБРОЙНЫМ НАРОДАМ.
КАНФЕРЭНЦЫЯ БАЛКАНСКАЙ АНТАНТЫ.

ЦВЁРДЫМ ПОСТУПАМ — ДА НОВЫХ ВЫШЫНЬ!

Наш соцыялістычны транспарт, акружаны выключнай увагай і клопатамі партыі і вялікага мудрага Сталіна, пад кіраўніцтвам свайго жалезнага наркома тав. Л. М. Кагановіча ўпэўнена і няўхільна ідзе наперад. Ён дасягае ўсё новых і новых вышынь.

У першым квартале 1936 стаханаўскага года армія чыгуначнікаў выканала сталінскі наказ — грузіць 80 тыс. вагонаў у дзень, і цяпер яна паспяхова змагаецца і ўжо ўшчыльную падыходзіць да ажыццяўлення лозунга Цэнтральнага Камітэта нашай партыі — грузіць 90 тыс. вагонаў. Першамайскі дзень транспартнікі адзначылі дастойным небывалым дагэтуль рэкордам. У гэты дзень было пагружана 111.700 вагонаў.

Партыя і ўрад высока ацанілі перамогу транспарту, большэвіцкую работу чыгуначнікаў. Тысяча перадавых людзей, энтузіястаў высокай прадукцыйнасці і культуры працы ўзнагароджаны ордэнамі Саюза. Гэтыя людзі прадстаўляюць сабой велізарную арганізуючую сілу. Сваім энтузіязмам, сваім асабістым прыкладам заражаюць яны і вядуць сотні і тысячы новых людзей, прасоўваючы наперад развіццё стаханаўска-крываносаўскага руху.

Самае бліскучае ў рабоце транспарту — гэта яго планамерны і ўпэўнены рух наперад, без штурмоўшчыны, без рыўкоў. Цвёрдым і ўпэўненым поступам транспарт завяёўвае адну пазіцыю за другою, замацоўвае іх і ідзе далей. Большэвіцкі грандыёзны размах работы, развіцця актыўнасці і ініцыятывы найшырэйшых мас сумяшчаецца тут з моцнай дысцыплінай і строга прадуманым планам дзеяння. У гэтых адносінах нашай прамысловасці, як і ўсім галінам народнай гаспадаркі, якія часта яшчэ працуюць рыўкамі, ёсць многа чаму павучыцца ў транспартнікаў.

Бліскучыя перамогі транспарту завяёваны карэннай і самай рашучай перабудовай яго работы. Тав. **Л. М. Каганович** — адзін з лепшых саратнікаў таварыша **Сталіна**, смела ўкараняе сталінскі стыль у работу транспарту. Рашуча выкарчоўваюцца адвечная закасцянеласць, бюракратызм, чыноўніцтва. Іменна на гэтых хваробах грунтавалася шкодніцкая «тэорыя прадзелу», якая апраўдвала адставанне транспарту і даказвала, што транспарт вычэрпвае ўсё, што больш даць ён не можа.

Пад кіраўніцтвам партыі, пры штодзённай асабістай увазе таварыша Сталіна, транспартнікі ўшчэнт разбілі гэту шкодніцкую «тэорыю».

Сталінская ўвага да людзей, клопаты аб іх, выключная ўвага вырошчванню, выхаванню новых кадраў, — што кожнадзенна і штогадзінна праяўляецца нашай партыяй ва ўсёй краіне і асабліва на транспарце, — гэтыя большэвіцкія клопаты забяспечылі найшырэйшае развіццё творчых здольнасцей і таленцяў работнікаў усіх спецыяльнасцей і кваліфікацый. За параўнаўча невялікі час на транспарце выраслі выдатныя кадры, сотні і тысячы людзей—сапраўдных герояў высокай прадукцыйнасці працы, людзей, якія не толькі самі даюць высокія ўзоры работы, але і вучаць, вядуць за сабой масы. Транспарт выхаваў выдатных, адданейшых нашай сацыялістычнай радзіме сыноў, якія тлыбока любяць сваю справу.

Прачытайце ўважліва расказы групы чыгуначнікаў-ордэнаносцаў —тт. **Егорава, Вілетнікавай, Байкачова** і інш., якія друкуюцца сёння ў «Звяздзе»! Гэтыя людзі, сваёй выдатнай работай заслужыўшыя высокую ўзнагароду, здольны рабіць цуды! Такіх-жа людзей на транспарце цяпер тысячы.

Таму незвычайна быстра нарастае тут магутны творчы ўздым мас, б'е крыніцай знаходлівасць, ініцыятыва, выяўляюцца ўсё новыя і новыя рэзервы. Імклівы напор мас да новых, небывалых яшчэ перамог нарастае магутнай хваляй і ахапляе найшырэйшыя масы чыгуначнікаў.

За работай транспарту з напружанай увагай сачыла і сочыць уся наша краіна. І гэта зусім зразумела. Транспарт з'яўляецца важнейшым нервам народнай гаспадаркі. Яго адставанне пагражала затрымаць далейшы пераможны рух гаспадаркі нашай краіны. Таму кожная новая перамога транспарту выклікае найвялікшую радасць, радаснае біенне сэрцаў не толькі чыгуначнікаў, але і кожнага рабочага, калгасніка, кожнага прапоўнага нашай краіны. Краіна акружыла чыгуначнікаў асаблівай увагай, найвялікшым гонарам.

На транспарце, як нідзе, высока ўзнят стаханаўскі рух. Паказальнікі социялістычнага спаборніцтва тут асабліва канкрэтныя. Вядзенне важкіх паяздоў, змяшэнне прастояў пад рамонтам і прамыўкай паравозаў, найбольшы прабег без астановак для набору вады і апалу — гэта паказальнікі, якіх дабіліся ўжо дзесяткі паравознікаў; яны знаходзяць усё большае і большае распаўсюджванне. Вакол загаду наркома тав. **Кагановіча** — працаваць без крушэнняў і аварый—цесна згуртавалася армія чыгуначнікаў. Сабатаж стаханаўскага руху тут сустракае найбольш ярасны і сакрушальны адпор, і ў гэтым зарука далейшых перамог транспарту.

Важнейшая задача чыгуначнікаў заключаецца зараз у тым, каб да ўзроўню перадавых людзей, працуючых без аварый, умеючых выкарыстоўваць тэхніку да дна, падцягнуць **усіх** работнікаў транспарту. Гэта будзе азначаць новы ўздым у рабоце, новую перамогу. Толькі тады транспарт будзе адказваць прад'яўляемым да яго патрабаванням, калі поўнасцю будуць зжыты аварыі і крушэнні, калі будзе дасягнута поўнае выкарыстанне ўсёй транспартнай гаспадаркі, калі будзе дасягнута поўная чоткасць у рабоце ўсіх частак транспарту, калі графік будзе ўсюды захоўвацца з дакладнасцю механізма гадзінніка. Гэта патрабуе, каб усе работнікі транспарту аўладалі высокай культурай працы.

Чыгуначнікі па праву ганарацца сваімі перамогамі, асабліва сваімі выдатнымі кадрамі—сталінскімі выхаванцамі, ордэнаносцамі і ўсімі лепшымі людзьмі, якія сваёй бліскучай работай забяспечылі перамогу транспарту. Ганарыцца гэтымі людзьмі ўся наша краіна.

Але наперадзе яшчэ адказныя і складаныя задачы. Няма сумнення, што транспартнікі быстра асвояць і выканаюць новую задачу, пастаўленую перад імі Цэнтральным Камітэтам нашай партыі і тав. Сталіным—грузіць 90 тыс. вагонаў у суткі.

Не менш важныя задачы стаяць і ў галіне пасажырскага руху. Наступіла лета. І зараз патрабаванні эканомікі, патрабаванні працоўных нашай краіны к транспарту значна павялічваюцца. Быстра расце культурны ўзровень працоўных, і трэба, каб транспарт не адставаў ад гэтага шпаркага культурнага росту. Гэтыя патрабаванні да транспарту павінны быць поўнасцю задаволены. Камандзіры і ўсе работнікі транспарту, як і ўвесь транспарт у цэлым, і **ў культурных** адносінах павінны быць на ўзроўні агульнага росту нашай краіны.

Няма сумнення, што транспарт, які сваёй большэвіцкай работай даказаў, як трэба выконваць заданні партыі, сваёй краіны, справіцца з любой задачай, якую паставіць перад ім социялістычная радзіма.

АБ НАДАННІ НОВАМУ АРШАНСКАМУ АЭРАКЛУБУ ІМЯ Н. Ф. ГІКАЛО

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **пастанаўляе:**

Ходайніцтва аршанскіх партыйных, совецкіх і грамадскіх арганізацый задаволіць і надаць аршанскаму аэраклубу імя **Н. Ф. Гікало.**

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

АДКРЫЛАСЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА СТАХАНАЎЦАЎ-ВЫДАТНІКАЎ ДЗЯРЖГАНДЛЮ

Учора, 7 мая, у Менску адкрылася ўсебеларуская нарада стаханаўцаў-выдатнікаў дзяржгандлю.

Пасля выбрання кіруючых органаў і ганаровага прэзідыума нарада заслухала даклад наркома ўнутранога гандлю БССР тав. Гурэвіча аб выніках выканання плана першага квартала і далейшых задачах барацьбы за выкананне плана тавараабароту 1936 года.

У нарадзе прымае ўдзел звыш 300 чал. — стаханаўцаў дзяржгандлю, кіраўнікоў гандлёвых аб'яднанняў гарадоў і раёнаў БССР.

На імя нарады атрымана прывітанне ад наркома ўнутранога гандлю СССР т. Вейцэра.

***

Пад бурныя апладысменты дэлегатаў і шматлікіх гасцей прынята прапанова аб пасылцы прывітання таварышам **Сталіну** і **Молатаву.**

НА ВЫШЫНІ 11.100 МЕТРАЎ

МАСКВА, 7 мая. (БЕЛТА). Раніцай 7 мая вядомы лётчык-выпрабавальнік тав. В. В. **Шэўчэнка** зрабіў першы веснавы рэйс у стратасферу. Ён лятаў на двухмесным адкрытым самалёце з маторам вадзянога ахладжэння. На гэтым самалёце лётчык Шэўчэнка падымаўся ў стратасферу не адзін раз. На гэты раз лётчык Шэўчэнка дасягнуў вышыні 11.100 метраў.

У гутарцы з супрацоўнікам ТАСС тав. Шэўчэнка аб сваім палёце расказаў наступнае:

— Сёнешнім трэніровачным палётам у вышыню я адкрыў летні сезон палётаў у стратасферу. Мой палёт цягнуўся 1 гадзіну 35 мінут.

Я лічу, што дасягнуты мною на гэтай машыне «патолок» не з'яўляецца прэдзелам.

Стаханаўскі дэкаднік МТС

Узняць адстаючыя МТС і брыгады да ўзроўню перадавых

МЕНСКІ РАЁН СКОНЧЫЎ СЯЎБУ ЗЕРНАВЫХ І ІЛЬНУ

5 мая Менскі раён скончыў сяўбу зернавых, бабовых і ільну на плошчы 17.787 гектараў. Гатунковым насеннем засеяна ў калгасах 5.397 гектараў або 113 проц. плана. Трактарнымі і коннымі сеялкамі засеяна 6.020 гектараў — 104 проц. Яравізаваным насеннем засеяна 247 гектараў. У калгасах і соўгасах раёна шырока разгорнуты работы па высокаякаснай пасадцы бульбы не пазней 10 мая.

Старшыня РВК ЖАРЫН.
Загадчык райземаддзела КЛЕЎКО.

РЭКОРД ТРАКТАРЫСТАЎ ПЕНЬКОЎСКАГА І РУДЗЕНІ

СОСНЫ, 7 мая. **(Па тэлеграфу).** Трактарысты-стаханаўцы соўгаса **імя X годдзя БССР,** Любаньскага раёна на трактары «Інтэрнацыянал» пры прыцэпе адной сеялкі засеялі за змену: тав. **Пенькоўскі** — 69,85 гектараў, тав. **Рудзеня** —68,63 гектары каналіц.

Соўгас скончыў сяўбу каналіц. Сяўба праведзена за два дні — 5 і 6 мая. Пасеяна 550 гектараў. Якасць добрая.

Трактары пераключаны на дапамогу суседнім калгасам.

Дырэктар соўгаса — ордэнаносец ПРОРВІЧ.
Начальнік палітаддзела ЛЯХАЎ.

БРЫГАДА ЗОНІ РАЧОК ПЕРАВЫКАНАЛА ПЛАН ВЕСНАВЫХ РАБОТ

КОПЫЛЬ, 7 мая. (Па тэлефону). Перадавая брыгада знатнага брыгадзіра **Зоні Рачок** выканала план веснавых работ на 137 проц. і радковай сяўбы — на 204 проц.

Выпрацоўка на «ХТЗ» за веснавую сяўбу складае 173 гектары. Трактарыст **Петручэня** выпрацаваў на сваім трактары 179 гектараў і **Пуцейка** — 240 гектараў.

Брыгада Зоні Рачок пераключылася на ўздым папару. За 4 дні дэкадніка чатыры трактары ўзялі папару 176 гектараў.

АЛХІМОВІЧ.
Намеснік дырэктара МТС па палітчасці.

НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ ЖАНОЧАЯ БРЫГАДА

ЗАСЛАЎЕ. **(Па тэлефону).** Па Заслаўскай МТС у дні стаханаўскай дэкады жаночая трактарная брыгада **Рачкоўскай Марыі** выйшла на першае месца. Трактарыстка гэтай брыгады **Барташэвіч Алеся** выпрацавала на трактары на гэты дзень 109,58 гектараў.

Трактарыст брыгады № 18 Рабушка Іван 2 мая ўзараў 9 гектараў за змену. Трактарыст **Грынкевіч Іосіф** засеяў за адну змену 26,5 гектараў. Трактарыст **Таранковіч** 4 мая за 9 гадзін узараў 7,50 гектараў.

Л. ПУТЫРСКАЯ.
Нам. дырэктара МТС па палітчасці.

ПЕРАДАВЫЯ БРЫГАДЫ

ЧАЧЭРСК, 7 мая. (Па тэлефону). Брыгада № 4 раней адстаючая, за першыя дні дэкадніка выйшла ў перадавыя. Брыгада заканчвае веснавыя палявыя работы. Трактарысты **Маркаў і Хадарэнка,** якія да дэкадніка ледзь выконвалі норму, зараз даюць па 10—11 гектараў.

Перадавой у дэкадніку вышла 5 брыгада, якая поўнасцю выканала план веснавых работ. Уся брыгада прэміравана.

ЛЕЗБЕРГ
Нам. дырэктара МТС па палітчасці.

ПРЫСТУПІЛІ ДА ПРАПОЛКІ АЗІМЫХ

ТУРАЎ, 7 мая. **(Па тэлеграфу).** Тураўскі раён 5 мая скончыў сяўбы зернавых, ільну і бульбы.

Сяўба праведзена высокаякасна. Паявіліся дружныя ўсходы яравых культур. Ва ўсіх калгасах прыступілі да праполкі азімых.

Падрыхтавана глеба пад пасеў канаплі, проса і позняй гародніны. Падрыхтоўваецца глеба пад грэчку.

Сакратар РК КП(б)Б ДАМБРОЎСКІ.
Старшыня РВК ШАРШНЁЎ.

ОРДЭНАНОСЕЦ ПЕЦКАЛЁВА ПРЭМІРАВАНА

СЕННО. Ільнаводчае звяно ордэнаносца **Ксені Пецкалёвай** з калгаса **«Івані»,** Пустынскага сельсавета першым скончыла сяўбу ільну, Высокаякасна засеяна 5,75 гектараў.

Ордэнаносец Пецкалёва змагаецца за 7 цэнтнераў вадкана з гектара. Зараз звяно прыступіла да збору дзёрнаў, карэнняў пыр'я і пустазелля з свайго ўчастка, загатаўляе колікі, якія будуць расстаўлены па полю, каб не палягаў лён.

У дні першамайскіх свят райком партыі і райвыканком прэміравалі Пецкалёву нікельным ложкам і іншым абсталяваннем для кватэры.

А. МАХНАЧ.

ЗА 10 ЦЭНТНЕРАЎ ІЛЬНУ З ГЕКТАРА

Калгасніцы звяна ордэнаноскі т. Т. Т. Шчалкуновай (калгас імя Шмідта, Вялікалуцкага раёна, Калінінскай вобласці) узялі на сябе абавязацельства зняць ураджай ільну 10 цэнтнераў з гектара.

НА ЗДЫМКУ: звяну Шчалку новай вызначаюць межы яго ўчастка. Злева направа: ордэнаноска т. Т. Т. Шчалкунова, землеўпарадчык райза т. Н. Н. Манаховіч і тэхнік райза тав. А. А. Майсеў.

(Саюзфота)

На палях Чэрнігаўскай вобласці

План сяўбы ранніх зернавых у спаборнічаючай з БССР Чэрнігаўскай вобласці на 5 мая выкананы на 103 проц. План сяўбы ільну выкананы на 89,1, бульбы — 22, буракоў — 91 процант. План сяўбы ўсіх культур выкананы на 56 проц.

На МТС і трактарных атрадах Чэрнігаўшчыны шырока разгорнута социялістычнае спаборніцтва на пяршынства. Большасць трактарыстаў вобласці змагаюцца за 2500 гектараў на «ЧТЗ» і 1200 на «ХТЗ».

Трактарыст Олішоўскай МТС т. **Барышкавец** васьмікорпусным плугом з дня ў дзень узорвае 14—16 гектараў. Трактарыст-комсамолец Нолеўскай МТС т. **Осадчы,** працуючы на баранаванні ворыва, забарановаў за змену 52 гектары. Трактарысты тт. **Лагута** і **Горбі,** працуючы метадамі Осадчага, сістэматычна перавыконваюць норму баранавання.

Трактарыст Глухаўскай МТС т. **Грабчук** разам са сваім напарнікам **Падарогаю** за тры дні на «ХТЗ» забаранавалі ў два сляды 60 гектараў. Тав. Грабчук на «ХТЗ» узорвае 12 гектараў. Ён абавязаўся давесці выпрацоўку на трактар да 15 гектараў і дань за сезон 1500 гектараў.

Сярэдняя выпрацоўка на «ХТЗ» у дзень маладой жаночай трактарнай брыгады ордэнаноскі **Касцючэнка** з Сямёнаўскай МТС складае 8 гектараў.

Вопыт перадавых не перадан адстаючым

СТАРЫЯ ДАРОГІ, 7 мая (Па тэлефону). У часе стаханаўскага дэкадніка асобныя трактарысты Стара-Дарожскай МТС значна ўзнялі выпрацоўку. Трактарыст **Смольскі** на трактары ХТЗ узараў за змену 13,5 гектараў. Тав. Смольскі выканаў план веснавых работ на 164 проц., а яго напарнік **Ермаковіч** — на 146 проц. Перавыконваюць нормы трактарысты **Баршчэўскі, Гудкоўскі, Воўк, Гелеш.**

Але метад работы лепшых трактарыстаў яшчэ не стаў здабыткам адстаючых. У МТС ёсць 4 адстаючыя брыгады. Дырэктар МТС тав. Мінін і яго намеснік па палітчасці тав. Галыгін нічога не зрабілі, каб выцягнуць адстаючыя брыгады з прарыву. Аб рабоце лепшых брыгад адстаючыя не ведаюць.

Кіраўніцтва МТС слаба кіруе работай трактарных брыгад у стаханаўскім дэкадніку.

РЫЗОЎ.

За пяць дзён стаханаўскай дэкады

СМАЛЯВІЧЫ. За першыя пяць дзён стаханаўскай дэкады Смалявіцкая МТС дабілася значных поспехаў у рабоце. Павялічыўся лік стаханаўцаў — іх зараз ёсць 14 чалавек. Трактарыст-стаханавец **Жылка** Андрэй выканаў свой план веснавых работ на 190 проц. і зэканоміў 545 кг. гаручага, трактарыст **Цімаховіч**—на 181,7 проц. і зэканоміў 293 кг. гаручага. 5 мая трактарыст **Альшэўскі** за адну змену засеяў 52 гектары аўса.

Увесь трактарны парк МТС 6 мая выканаў план веснавых работ. Зараз трактары пераключаны на звышпланавую сяўбу і ўздым папару.

ТРАКТАРЫСТ ЧУБУКОЎ ЗАСЕЯЎ 50 ГЕКТАРАЎ.

ХОЦІМСК, 7 мая. (Па тэлеграфу). Знатны трактарыст Хоцімскай МТС тав. **Чубукоў Раман**—удзельнік усесаюзнай нарады перадавікоў на ўраджайнасці — ў адказ на пісьмо тав. **Гікало** засеяў за змену 50,10 гектараў аўса.

ХАНІН.
Нам. дырэктара МТС па палітчасці.

СЕЮЦЬ ЗВЫШ ПЛАНА НА АСВОЕНЫХ БАЛОТАХ

КАМАРЫН, 7 мая. Многія калгасы раёна, якія выканалі свае планы веснавой сяўбы, зараз сеюць звыш плана на балотных масівах, асвоеных гэтай вясной. Калгас **«Дзень калектывізацыі»** звыш плана засеяў на асвоеных балотах 20 гектараў аўса, калгас **«Дняпроўскі араты»**—21 гектар. Калгаснікі мяркуюць атрымаць на гэтых участках па 25 цэнтнераў, з гектара.

Калгасамі раёна ўжо засеяна на асвоеных балотах 225 гектараў зернавых.

ТРАКТАРЫСТ ВЕРХАЎ ЗА ЗМЕНУ ЗАРАБІЎ 115 РУБЛЁЎ.

ЖЛОБІН, 7 мая. Трактарыст-стаханавец з першай трактарнай брыгады Жлобінскай МТС **Верхаў Рыгор** штодзённа з пачатку стаханаўскай дэкады сваю норму выконвае на 250 — 280 проц. 6 мая Верхаў трохлямешным плугам на трактары «ХТЗ» за 9 гадзін узараў 9,13 гектараў, пры норме 3.2 гектара. За гэту змену ён зарабіў 115 рублёў.

ЗАБАРАНАВАНА ЗА ЗМЕНУ 130 ГЕКТАРАЎ

ЧАВУСЫ. (Па тэлефону). Лепшыя трактарысты Чавускай МТС паказваюць добрыя ўзоры работы. Трактарыст **Кабанькоў Іван** за змену пракультываваў 30 гектараў і забарановаў 30 гектараў, замест нормы 11,5 гектара.

Трактарыст **Шабовіч** за 8 гадзін работы забарановаў на «ЧТЗ» 130 гектараў.

На ворыве трактарыст Халецкі дае ў змену 10 гектараў. Работа праходзіць круглыя суткі. Кожная выпрацоўка афармляецца актамі. Якасць работы трактараў добрая.

ЖЭЛЕЗНЯКОЎ.
Дырэктар Чавускай МТС

ВЫПУСК ВАЕННЫХ АКАДЭМІЙ У КРЭМЛІ

На беззаганна вылашчаным пляцу сярод старадаўніх крэмлёўскіх будынкаў выстраілася строгае ваеннае кара. Праходзячы перад строем, начальнікі яшчэ і яшчэ раз прыдзірліва аглядваюць рады.

У гэтых радах стаяць не абыдзенныя байцы. Гэта камандзіры і больш таго — камандзіры, скончыўшыя вышэйшыя і лепшыя ваенныя школы Совецкага Саюза. Гэта выпускнікі Ваеннай акадэміі РСЧА імя Фрунзе, Ваенна-паветранай акадэміі імя Жукоўскага, Ваеннай акадэміі імя Варашылава, Ваенна-інжынернай імя Куйбышэва, Ваенна-транспартнай імя Кагановіча, Інжынерна-тэхнічнай акадэміі сувязі імя Падбельскага.

Сёнешні дзень — доўгачаканы і знамянальны дзень, які завяршае сабой некалькі год няжкай, напружанай, усебаковай вучобы і практыкі, — дзень сканчэння акадэміі і выпуску, у здказнай і ўрачыстай абстаноўцы, у сэрцы совецкай краіны і сталіцы — у Крэмлі.

Гадзінніх на Спасскай вежы б'е два. Каманда «смірна!». Аркестр іграе сустрэчу, і ад будынка ЦВК і Саўнаркома к фронту выпускнікоў набліжаецца група кіраўнікоў партыі і ўрада: старшыня ЦВК СССР тав. М. І. Калінін, старшыня Саўнаркома Саюза ССР тав. В. М. Молатаў, народны камісар абароны маршал Совецкага Саюза тав. К. Е. Варашылаў, намеснікі старшыні Саўнаркома СССР тт. В. Я. Чубар і Н. К. Анціпаў, сакратар ЦК ВКП(б) тав. А. А. Андрэеў, начальнік генеральнага штаба РСЧА маршал А. І. Егораў і іншыя.

Таварышы М. І. Калінін і К. Е. Варашылаў вітаюцца з выпускнікамі. Тав. Калінін прымае рапарт камандуючага парадам начальніка ваеннай акадэміі РСЧА імя Фрунзе камандарма 2-га рангa А. І. Корка.

Пасля агалашэння начальнікамі акадэмій загадаў народнага камісара абароны Саюза ССР аб выпуску старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР тав. М. І. Калінін звяртаецца да выпускнікоў з наступным прывітаннем:

— Таварышы чырвоныя камандзіры, палітработнікі, ваенныя інжынеры і ўрачы, скончыўшыя ваенныя акадэміі РСЧА!

Ад імя ўрада і партыі вітаю новы атрад высокакваліфікаваных работнікаў, якія ўліваюцца ў нашу Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію.

Задачы, якія стаяць перад нашай Чырвонай Арміяй, у вышэйшай ступені адказны, а ў сувязі з гэтым і задачы, якія стаяць перад камандным складам нашай арміі, вялікія. Ужо адно тое, што правадыр народаў СССР таварыш Сталін велізарную частку свайго часу і ўвагі аддае нашай Чырвонай арміі, паказвае, якое значэнне ў агульным будаўніцтве, гаспадарцы і культуры нашага Совецкага Саюза займае Чырвоная Армія.

Можна смела сказаць, што спакой, адносны спакой, існуючы на нашых граніцах, ёсць рэзультат той велізарнай ваеннай работы, той сілы і арганізаванасці, якія накапіла і якімі ўладае Чырвоная Армія.

Таварышы! Кожная галіна працы, кожны ўчастак культуры з кожным годам патрабуюць усё больш і больш высокай якасці работы. Калі гэта патрабаванне правільна ў адносінах прамысловасці і культурнага фронта, то гэта тым больш адносіцца да Чырвонай арміі. І я не сумняваюся, што вы, скончыўшыя ваенныя акадэміі, зноў ідучы на практычную работу ў Чырвоную армію і прамысловасць, унясеце новую кольскасць так неабходнай высокакваліфікаванай працы ва ўсе галіны вашай работы.

Няхай жыве наша доблесная Чырвоная армія!

Няхай жыве правадыр Чырвонай Арміі таварыш Варашылаў!

Няхай жыве правадыр народаў СССР таварыш Сталін! Ура!

Прывітанне тав. Калініна перакрываецца гучнымі крыкамі «ўра».

Тав. **Молатаў.** Няхай жывуць акадэмікі нашай слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі! Ура!

(Гучныя крыкі «ўра» акадэмікаў-выпускнікоў).

Народны камісар абароны маршал Совецкага Саюза тав. Варашылаў ад імя Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі віншуе выпускнікоў з паспяховым сканчэннем сур'ёзнай вучобы ў акадэміях.

«Сёння, — гаворыць тав. Варашылаў, — Рабоча-Сялянская Армія з распрасцёртымі абымкамі ўключае вас, камандзіраў ваенных інжынераў, урачоў, у свае рады; яна чакае ад вас работы, кваліфікаванай, напружанай, арганізаванай.

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія прывыкла штогод атрымліваць з ваенных акадэмій атрад высокакваліфікаваных кіраўнікоў баявой і палітычнай вучобы. У вашай асобе яна атрымае вялікую падмогу ў сваёй усё больш складанай, усё больш і больш адказнай і вялікай рабоце».

Голаснае, дружнае **«ўра»** пакрывае словы любімага наркома.

Новая голасная выразная каманда тав. Корка. Ва ўрачыстым маршы выпускнікі праходзяць перад кіраўнікамі партыі і ўрада.

Але акадэмікаў чакае сёння яшчэ большая радасць. Праз чвэрць гадзіны, ужо не ў страі, а за доўгімі, святочна прыбранымі сталамі, у велічнай Георгіеўскай зале Вялікага Крэмлёўскага палаца яны — госці совецкага ўрада.

Спатканы бурай авацыі і крыкамі «ўра», акружаны вернымі саратнікамі, членамі Цэнтральнага Камітэта партыі і ўрада, у зале з'яўляецца таварыш **Сталін.** Тысячы вачэй, смелых, разумных, камандзірскіх, большэвіцкіх вачэй з любоўю і хваляваннем гляджуць на правадыра народаў. Гэта незабыўная сустрэча застаецца моцным зарубкам ва ўсім жыцці камандзіраў - акадэмікаў, жыцці, цалкам аддаданага совецкай радзіме і яе абароне.

Ад імя Цэнтральнага Камітэта партыі і ўрада маршал Совецкага Саюза тав. К. Е. Варашылаў віншуе выпускнікоў і напамінае ім аб той велізарнай перамене абстаноўкі і тым эканамічным і культурным росквіце ўсёй совецкай краіны ў цэлым і яе Чырвонай Арміі ў прыватнасці, які адбыўся за гады прабывання камандзіраў у сценах акадэміі. Гэты бурны ўздым і ўдасканаленне совецкага народу даюць камандзірам-акадэмікам велізарныя магчымасці для іх работы і разам з тым патрабуюць ад іх асабліва высокай кваліфікацыі. Таварыш Варашылаў вітае новыя, каштоўныя камандзірскія папаўненні непераможнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Таварыш Варашылаў агалашае тост за нашу вялікую краіну, за ўвесь вялікі совецкі народ, за таго, хто вядзе нашу краіну ад перамогі да перамогі, хто натхняе ўсіх нас на барацьбу, хто кіруе ўсімі намі, хто больш за ўсё клапоціцца аб тым, каб слава нашай радзімы, слава нашай Чырвонай арміі гучэла мацней і грамчэй, за нашага Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Бурай авацыі, доўга не змаўкаючымі апладысментамі, тысячагалосым «ўра» адказвае зала на словы тав. Варашылава.

Пад бурныя авацыі і поўныя захапленне апладысменты ўсіх прысутных тав. Варашылаў агалашае тост за рабоча-сялянскі ўрад і яго кіраўніка — Вячэслава Міхайлавіча Молатава — першага памочніка таварыша Сталіна, за любімага совецкага прэзідэнта Міхаіла Іванавіча Калініна.

Потым з прамовай выступае тав. Калінін. Ён гаворыць аб сіле Чырвонай Арміі, аб большэвіцкай партыі і аб тым чалавеку, які кіруе Чырвонай Арміяй, удасканальвае яе магутнасць, выхоўвае яе кадры, з'яўляючыся ва ўсёй сваёй рабоце ўзорам большэвіка-рэвалюцыянера — аб правадыру Чырвонай Арміі Клімэнце Ефрамавічу Варашылаве. Бурнай авацыяй, гарачымі воклічамі, грамавымі крыкамі «ўра» сустракаюць выпускнікі імя любімага наркома, вернага саратніка таварыша Сталіна.

Прыём заканчваецца выступленнямі чырвонаармейскага ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі Саюза ССР і лепшых артыстаў маскоўскіх тэатраў.

ПАЛІТЫКА ФРАНЦУЗСКАЙ КОМПАРТЫІ

ПАРЫЖ, 6 мая. (БЕЛТА). Сёння ўвечары комуністычныя дэпутаты Марыс Тарэз і Жак Дзюкло запрасілі прадстаўнікоў французскай і міжнароднай прэсы, якім зрабілі заяву аб палітыцы французскай компартыі.

Тарэз яшчэ раз пацвердзіў, што **комуністы не будуць прымаць удзелу ў новым урадзе,** які будзе створан у рэзультаце апошніх выбараў, аднак **акажуць яму поўнае падтрыманне ў правядзенні праграмы народнага фронта.** У прыватнасці, комуністы зараз-жа пасля таго як збярэцца новая палата, унясуць рад законапраектаў, якія прадугледжваюць абкладанне буйнага капітала, арганізацыю грамадскіх работ для дапамогі беспрацоўным, мерапрыемствы па ахове мацеры і дзяцінства, арганізацыю фізічнага выхавання, дапамогу сялянству, у прыватнасці ў галіне палітыкі цэн на сельскагаспадарчыя прадукты, і т. д.

У новай палаце, як і па-за ёю, комуністы **будуць змагацца за палітыку міру, аснаваную на калектыўнай бяспецы ў рамках Лігі нацый.** Тарэз яшчэ раз падкрэсліў неабходнасць больш цеснага супрацоўніцтва з чэхаславацкай дэмакратыяй. Ён указаў таксама, што трэба ўсімі сродкамі садзейнічаць звароту Польшчы ў кола дзяржаў, зацікаўленых у захаванні еўрапейскага міру. Пры гэтым ён падкрэсліў, што з пункту гледжання французскіх комуністаў **захаванне незалежнасці Польшчы з'яўляецца адной з зарук гэтага міру.**

На канферэнцыі прэсы прысутнічала больш ста чалавек. Многія месцы ў заяве Тарэза і Дзюкло пакрываліся апладысментамі.

Партыйнае будаўніцтва

ВОПЫТ ВЫХАВАННЯ АДСТАЮЧЫХ КОМУНІСТАЎ

Асобныя партыйныя арганізацыі Беларусі фармальна падыходзілі да выяўлення пасіўных камуністаў. Былі выпадкі, калі сакратары первічных партыйных арганізацый, а часамі і сакратары райкомаў партыі, грунтуючыся на адным якім-небудзь фармальным прызнаку, залічалі камуністаў у пасіўныя, прадвырашаючы такім чынам пытанне аб яго партыйнасці. Так, на фабрыцы «КІМ» (Віцебск) партком залічыў у спіс пасіўных кандыдата партыі Раскіну, маючую шаснаццацігадовы вытворчы стаж, стахановку. Гэту работніцу нават не выклікалі ў партком. З ёю ніхто не пагаварыў, не пацікавіліся ўмовамі, у якіх працуе камуністка. І толькі таму, што Раскіна рэдка выступае на партыйных сходах, яе залічылі ў пасіўныя.

Калі пасля нашых указанняў, сакратары райкомаў асабіста ўзяліся за вывучэнне прычын адставання асобных камуністаў, то перш-нас, што кінулася ў вочы, многія камуністы вельмі марудна палітычна растуць з-за малаграматнасці.

Многія райкомы арганізавалі агульнаадукацыйныя гурткі, школы, прымацавалі настаўнікаў да малапісьменных. Усе гэтыя мерапрыемствы ў першыя-ж месяцы далі сур'ёзныя рэзультаты. У камуністаў, раней адставаўшых у палітвучобе, павысілася зацікаўленасць да партыйных заняткаў, яны сталі больш актыўна прымаць удзел у рабоце палітшкол, лепш рыхтавацца да заняткаў.

У працэсе падрыхтоўкі к абмену партдакументаў у партыйнай арганізацыі станцыі Віцебск-Таварная парторг звярнуў увагу на тое, што камуніст Васілевіч, саставіцель вагонаў, стаў адставаць у вытворчасці, не прымае актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці перастаў наведваць партыйныя сходы, закінуў вучобу. Гэта асабліва было прыкметна таму, што Васілевіч увесь час быў ударнікам і актывістам. Парторг пашоў на кватэру да Васілевіча. Тут у прыяцельскай гутарцы выявілася, што Васілевіч не задаволен сваёй работай. Да Васілевіча чамусьці не захацелі прымацаваць пэўны паравоз, што перашкаджала яму працаваць па-стаханаўску. І таму ён стаў менш актыўным і ў партыйным жыцці. Парторг дапамог тав. Васілевічу. Да яго прымацавалі паравоз, дапамаглі ў вучобе, акружылі ўвагай. І тав Васілевіч цяпер — важак стахановскага руху сярод саставіцеляў, актыўнейшы член партыі.

Сур'ёзную выхаваўчую ролю адыгралі самасправаздачы адстаючых камуністаў. Спачатку самасправаздачы насілі фармальны, казённы характар. Райкомам было ўказана на недахопы ў пастаноўцы самасправаздач камуністаў, асабліва адстаючых.

Большасць партыйных арганізацый выправіла памылкі. Да самасправаздачы камуніст цяпер рыхтуецца 5—7 дзён. З яго работай да самасправаздачы знаёміцца адзін з членаў партыйнай арганізацыі, які бывае дома ў камуніста, давёдваецца, якую ён чытае літаратуру, правярае вучобу ў партшколе, работу на вытворчасці, выкананне партыйных даручэнняў і т. д. Толькі пасля такой падрыхтоўкі самасправаздача камуніста ставіцца на сходзе партыйнай арганізацыі або на пасяджэнні бюро райкома. Побач з крытыкай недахопаў партарганізацыі пры самасправаздачы камуніста галоўную ўвагу аддае выясненню таго, што перашкаджае камуністу актыўна ўключыцца ў партыйнае жыццё, стаць перадавіком на вытворчасці. Вось што гаварыў на самасправаздачы раней адставаўшы камуніст Кандраценка (партарганізацыя соўгаса «Межава», Аршанскага раёна).

— Цяпер я стаў лепш праваць над сабой і актыўна прымаць удзел у партыйным жыцці. Я зразумеў, што так далей быць не можа. Статут партыі трэба выконваць на справе.

Побач з дапамогай адстаючым камуністам партыйныя арганізацыі больш рашуча сталі вызваляцца ад сапраўды пасіўных людзей, баласту, людзей, выпадкова пралезшых у партыю.

Праверка партдакументаў і падрыхтоўка да абмену дапамаглі падняць пільнасць партыйных арганізацый. У працэсе абмену былі дадаткова выкрыты ворагі, чужыя людзі, услізнуўшыя ў перыяд праверкі партдакументаў. Многія нашы раёны — раёны пагранічнай паласы. Гэта знаходзіць сваё адлюстраванне і ў абмене партдакументаў. Камуніст, прыходзячы абменяць партдакументы, расказвае не толькі аб тым, як ён аўладаў тэхнікай вытворчасці, марксісцка-ленінскай тэорыяй, але і аб тым, як ён працуе над асваеннем тэхнікі ваеннай справы, каб у любую мінуту быць гатовым стаць на абарону нашай радзімы.

Г. РУБІНШТЭЙН.

Загадчык аддзелам кіруючых парторганаў ЦК КП(б)Б.

(«Правда»).

АГЛЯД ДРУКУ

ВЫНІКІ ПАЛІТЫЧНАЙ СЛЕПАТЫ РЭДАКТАРА

Бюро ЦК КП(б)Б у спецыяльнай пастанове «Аб становішчы падрыхтоўкі да абмену партдакументаў па крупскай партарганізацыі» адзначыла, што крупская райпартарганізацыя зусім не падрыхтавалася да абмену партыйных дакументаў, што крупскі РК не растлумачыў камуністам важнейшых палітычных задач, якія стаяць перад партыйнай арганізацыяй у сувязі з абменам. Бюро ЦК не дазволіла абмен партыйных дакументаў па крупскай партыйнай арганізацыі.

Пастанова бюро ЦК з'яўляецца суровейшым папярэджаннем не толькі для крупскага РК КП(б)Б, але і для яго органа — раённай газеты «Комуністычны шлях». Рэдакцыя крупскай газеты абавязана была зрабіць з гэтага папярэджання практычныя вывады, рашуча палепшыць прапаганду важнейшага палітычнага значэння абмену партыйных дакументаў, асвятленне падрыхтоўкі да абмену. На вялікі жаль, гэтага не здарылася. Не здарылася таму, што рэдактар «Комуністычнага шляха» не разумее задачы газеты — органа партыйнага камітэта — у сувязі з абменам партыйных дакументаў. Доказам гэтага з'яўляецца камплект газеты за апошнія тры месяцы.

За выключэннем артыкула, прысланага прэсбюро, «Абмен партыйных дакументаў», газета за тры месяцы не змясціла ні аднаго артыкула аб важнейшым палітычным значэнні абмену партыйных дакументаў, аб задачах усёй партыйнай арганізацыі, кожнага камуніста ў сувязі з абменам. Абмену партыйных дакументаў газета не прысвяціла ні аднаго перадавога артыкула. Яна нават не перадрукавала ні адзінага з шматлікіх артыкулаў «Правды», прысвечаных гэтаму важнейшаму мерапрыемству партыі.

«Комуністычны шлях» не асвятляў і не асвятляе і ходу падрыхтоўкі ў партарганізацыі раёна да абмену партыйных дакументаў. Больш таго, замест мабілізацыі партыйнай арганізацыі газета дэзарыентавала камуністаў раёна ў пытаннях падрыхтоўкі да абмену, калі ў артыкуле інструктара РК **Русанава** «Рыхтавацца да абмену партыйных дакументаў» пісала, што:

«Большасць партыйных арганізацый перабудавалі сваю работу, паклаўшы ў аснову не палітыка-масавую работу па выкананню членаў і кандыдатаў партыі».

Гэта ў той час, як бюро ЦК канстатавала поўную непадрыхтаванасць крупскай партарганізацыі да абмену партыйных дакументаў, адзначыла, што комуністам не растлумачана важнейшае палітычнае значэнне абмену.

Пастанову бюро ЦК «Аб становішчы падрыхтоўкі да абмену партдакументаў па крупскай партарганізацыі» крупская газета змясціла 24 сакавіка на апошняй паласе і нават не палічыла патрэбным выступіць з перадавым артыкулам, які-б мабілізаваў партыйную арганізацыю на большавіцкую падрыхтоўку да абмену, на рэалізацыю ўказанняў ЦК. Газета змясціла пастанову ЦК і супакоілася. Ні аднаго радка аб ходзе падрыхтоўкі да абмену пасля пастановы ЦК у «Комуністычным шляху» няма. А прайшло ўжо больш месяца, вышла за гэты час 15 нумароў газеты.

МАНГОЛЬСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА

Пад кіраўніцтвам народна-рэвалюцыйнай партыі і пры падтрымцы Совецкага Саюза, раней забіты і адсталы качавы народ здолеў зрабіць першыя паспяховыя крокі па шляху індустрыялізацыі. У рэспубліцы зараз ёсць рад прадпрыемстваў: сучасны аўтатранспарт, тэлеграфная, радыётэлеграфная і тэлефонная сувязь.

НА ЗДЫМКУ: тры розныя віды мангольскага транспарту—коні, вярблюды і аўтамашыны.

Фота САЮЗФОТО.

ПАСЛЯ АКУПАЦЫІ АДЫС-АБЕБЫ

„Перамога" над бяззбройным народам

«АБІСІНІЯ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ІТАЛЬЯНСКАЙ»

РЫМ, 6 мая. (БЕЛТА) Учора ўвечары кіраўнік італьянскага ўрада Мусаліні з балкона свайго палаца выступіў з прамовай у сувязі з уступленнем італьянскіх войск у сталіцу Абісініі — Адыс-Абебу.

У пачатку сваёй прамовы Мусаліні зачытаў тэлеграму, атрыманую ад маршала Бадольо, у якой указваецца, што ён учора на чале італьянскіх войск уступіў у Адыс-Абебу.

«Я абвяшчаю італьянскаму народу і ўсяму свету,—сказаў Мусаліні, — што вайна скончана. Я абвяшчаю італьянскаму народу і ўсяму свету, што мір адноўлен».

«Але зусім неабходна,—гаварыў далей Мусаліні, — каб я далаў, што гутарка ідзе аб нашым міры, аб рымскім міры, які выражаецца ў наступлай, прытым нязменнай і акрэсленай формуле: «Эфіопія (Абісінія) з'яўляецца італьянскай».

«Мір з насельніцтвам Эфіопіі—прадаўжаў Мусаліні — з'яўляецца ўжо адбыўшымся фактам. Шматлікія расы былой імперыі вельмі ясна выказалі сваё жаданне жыць і працаваць спакойна пад трохкаляровым сцягам Італіі. Пераможаныя правадыры і расы, а таксама ўцекачы, больш не павінны прымацца пад увагу, і ніякая сіла ў свеце ніколі не зможа ператварыць іх у фактар, з якім трэба лічыцца. На сходзе 2 кастрычніка я ўрачыста абвясціў, што я зраблю ўсё магчымае з мэтай не дапусціць, каб афрыканскі канфлікт разрос'я ў еўрапейскую вайну. Я стрымаў гэта абавязацельства і я больш чым калі-небудзь перакананы, што парушыць мір у Еўропе азначае прывесці да краху самую Еўропу.

Але я павінен тут-жа дадаць, што мы гатовы абараняць нашу дзівосную перамогу з той-жа няўхільнай рашучасцю, з якою мы не заваявалі». Мусаліні закончыў сваю прамову наступнымі словамі: «Мы прайшлі адзін этап нашага шляху. Будзем далей маршыраваць да міру, да мэт, якія нас чакаюць заўтра».

АСЦЯРОЖНЫЯ КАМЕНТАРЫІ АНГЛІЙСКІХ ГАЗЕТ

ЛОНДАН, 6 мая. (БЕЛТА). Газета «Дэйлі тэлеграф», каментуючы ў перадавым артыкуле прамову Мусаліні, піша, што маюцца ў ёй «некаторыя пераўвелічэнні можна выбачыць пры няперашніх акалічнасцях». Далей газета ўказвае, што асваенне такой вялікай тэрыторыі, як Абісінія, патрэбуе шмат намаганняў, нават калі будзе адноўлен парадак.

Лічачы найбольш важнай заяву Мусаліні, што ўся Абісінія з'яўляецца італьянскай тэрыторыяй, газета ў асцярожнай форме выказвае думку, што Мусаліні яшчэ не сказаў апошняга слова па гэтаму пытанню.

НЕСПАКОЙ У ЛАГЕРЫ АГРЭСАРАЎ

БЕРЛІН, 6 мая. (БЕЛТА). Учарайшая прамова Мусаліні зрабіла на германскі друк далёка не спрыяючае ўражанне. Германскія газеты лічаць, што гэта прамова сведчыць аб намеры італьянскага ўрада пасля перамогі ў Абісініі далучыцца да лагера «насычаных» краін, якія жадаюць міру.

«Італія становіцца ў рады дзяржаў, якія выступаюць за захаванне статус-кво (існуючае становішча), і тым самым зноў мяняецца ўсё планаванне на еўрапейскай шахматнай дошцы», — так каментуе прамову Мусаліні перадавік газеты «Берлінер тагеблат».

З другога боку, германскі друк усімі мерамі стараецца скампраметаваць ідэю прымянення санкцый супроць агрэсара, спасылаючыся на адмоўны вопыт італа-абісінскай вайны.

ЗАЯВА АБІСІНСКАГА НЕГУСА

ЛОНДАН, 6 мая. (БЕЛТА). Карэспандэнт газеты «Дэйлі тэлеграф» у Джыбуці гутарыў з абісінскім негусам. Негус заявіў, што ён «не ўцёк ад свайго народу».

— Я пакінуў краіну не з боязні прадаўжаць вайну, — сказаў негус, а таму, што я пераканаўся ў поўнай немагчымасці для маіх паважаных і храбрых воінаў біцца з праціўнікам, які прымяняе сучасныя сродкі, у асаблівасці газы. Таму я пакінуў краіну, каб уніклуць далейшага кровапраліцця і разбурэння Адыс-Абебы.

Абісінскі пасланнік у Лондане ўчора ўвечары заявіў, што негус прыбудзе ў Лондан, каб «асабіста звярнуцца з заклікам аб справядлівасці для Абісініі».

***

СТАКГОЛЬМ, 6 мая. (БЕЛТА). Шведская газета «Гетэборгс хандэльстыднінг» публікуе інтэрв'ю з былым ваенным советнікам абісінскага негуса — шведскім генералам Віргінам, які заявіў, што ён здзіўлен ніўдачам Абісініі і можа іх разглядаць толькі як унутраны распад.

«Для абісінскіх улад наступіў такі-ж распад, як і для германскіх у 1918 г.», — дадаў ён. Калі-б абісінцы змаглі пратрымацца яшчэ тры тыдні, выхад падзей быў-бы зусім іншым. Ад'езд негуса, як відаць, выклікан не толькі чыста ваеннымі абставінамі.

ДЭЯЛЬБА КАЛАНІЯЛЬНАЙ ЗДАБЫЧЫ

ЛОНДАН, 6 мая. (БЕЛТА). Пазіцыя, займаемая сёння асноўнымі кансерватыўнымі газетамі, сведчыць аб узмацніўшымся ва ўрадавым лагеры Англіі імкненні не дапусціць неабмежаванага кантролю Італіі над усёй Абісініяй і забяспечыць Англіі адпаведную долю ў дэяльбе каланіяльнай здабычы.

Дыпламатычны аглядальнік газеты «Дэйлі тэлеграф» паведамляе, што паміж Англіяй і Італіяй пачаўся ўжо абмен думкамі аб становішчы, якое стварылася пасля акупацыі Адыс-Абебы.

Ёсць рад указанняў, што Англія зацікаўлена ў тым, каб забяспечыць сабе сферу ўплыву ў заходніх правінцыях Абісініі, у раёне паміж Курмук і возерам Рудольф.

***

ПАРЫЖ, 5 мая. (БЕЛТА). Газеты ў газеце «Эўр» сцвярджае, што французскія кіруючыя колы зусім не маюць намеру прадаставіць італьянцам такое панаванне ў Абісініі, якое магло-б пагражаць інтарэсам Францыі ў Афрыцы.

Французы будуць дабівацца склікання франка-англійска-італьянскай канферэнцыі для перагляду ўсіх адпаведных дагавораў адносна Абісініі.

Грубае парушэнне унутрыпартыйнай дэмакратыі

Сход партыйнай групы ватэрнага цэха фабрыкі імя Кагановіча праходзіць з вялікай актыўнасцю. Абмяркоўваецца пытанне аб выбары новага партыйнага арганізатара. Да выбараў усе комуністы абмяркоўваюць работу партыйнага арганізатара тав. Баранавай. Усе комуністы выказаліся, што Баранава, як партыйны арганізатар, сябе не апраўдала; яна груба абыходзіліся з рабочымі, не лічыліся з думкамі камуністаў; парт-масавая работа разгорнута выключна слаба, у рэзультаце чаго ватэрны цэх амаль ніколі не выходзіў з прарыву.

Пасля гарачых спрэчак выявілася, што т. Баранава не з'явілася на сход ватэрнага цэха таму, што за два дні да гэтага яна была выбрана, па прапанове партыйнага камітэта парторгам падрыхтоўчага цэха.

Так груба парушаецца ўнутрыпартыйная дэмакратыя, прычым гэта робіцца пад націскам самога сакратара парткома тав. Самсоненка.

На фабрыцы за два гады змянілася 7 сакратароў парткомаў (тт. Квінто, Сушчанкоў, Смірноў, Фінкельштэйн). Праз некаторы час прышоў зноў Сушчанкоў, Жукава, Хабец і інш. Многія з іх, як Фінкельштэйн, Сушчанкоў, правалілі работу. Некаторыя сакратары парткома пераходзілі на іншую работу. Але ні адзін сакратар парткома не адчуваўся за сваю работу перад партыйнай арганізацыяй, нават пакідалі работу проста без здачы спраў і без ведама партыйнай арганізацыі.

Аднойчы сакратар парткома тав. Самсоненка выклікаў да сябе члена партыі Шульмана з партгрупы падрыхтоўчага цэха і сказаў, што ён прызначаецца парторгам ватэрнага цэха, бо партыйны арганізатар занядужаў. І Шульман быў прызначан партыйным арганізатарам без ведама і выбараў саміх комуністаў.

У гэтай партарганізацыі на працягу двух год ні партыйны камітэт, ні партыйны арганізатар не адчытваюцца аб сваёй рабоце перад комуністамі. Партыйны камітэт не лічыцца з думкамі комуністаў. Прапановы комуністаў, якія прымаюцца на сходзе, і рашэнні партыйнага схода не праводзяцца ў жыццё.

Парушэнне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі мае месца і ў іншых партарганізацыях Віцебска. Вось для прыкладу партыйная арганізацыя завода імя Кірава. Тут сакратаром парткома зараз з'яўляецца тав. Палей. Яго папярэднікам быў тав. Сымонін, які пераведзен на гаспадарчую работу — дырэктарам завода імя Комінтэрна. Тав. Сымонін перад уходам не толькі не зрабіў справаздачы аб сваёй рабоце, але нават не давёў да ведама партарганізацыі аб тым, што яго пасылаюць на другую работу. На працягу двух месяцаў мяняліся сакратары парткомаў, іх нават не выбіралі на сходзе партыйнай арганізацыі, а проста прызначалі, і нават быў такі факт, калі абавязкі сакратара парткома выконваў тав. Піменцейн, не будучы членам парткома.

Вось ужо год сакратаром парткома з'яўляецца тав. Палей і за гэты час не было ні аднаго справаздачнага даклада аб рабоце парткома.

Партыйныя арганізатары цэхаў таксама не лічаць патрэбным адчытвацца аб сваёй рабоце перад членамі партгрупы. З 7 партыйных груп справаздача на партыйным камітэце была пастаўлена толькі адной партгрупы — рамонтнага цэха, і толькі па настаянню комуністаў.

У гэтай-жа партыйнай арганізацыі груба парушаюцца прынцыпы выбарнасці партыйных арганізатараў. На працягу сакавіка месяца партарганізатары сельскагаспадарчага і рамонтнага цэхаў — тт. Цурко і Фрыдман — былі ў Менску на вучобе. Свае справы яны механічна здалі, па прапанове парткома, выпадкова папаўшым пад рукі комуністам. На партыйных групах пытанне аб іх адсёдзе і іх намесніках не абмяркоўвалася і комуністы не ведалі, хто з'яўляецца партыйным арганізатарам.

Віцебскі гарком партыі ведае, што ў многіх партыйных арганізацыях груба парушаецца ўнутрыпартыйная дэмакратыя. Аднак у Віцебску звыкліся з гэтым. Больш таго: гарадскі камітэт партыі, не адчытваецца аб сваёй рабоце перад партарганізацыяй дапо некалькі год. Члены пленума гаркома не інфармуюць свае партыйныя арганізацыі пра пытанні, якімі займаецца гарком. Член гаркома тав. Дынфельд (працуе на заводзе імя Кірава) гаворыць, што гарком партыі ў штодзённую работу яго не ўцягвае. 2 гады назад гарком даў яму два даручэнні — праверыць рабочыя кватэры і адгрузку бульбы Ленінграду. Ён іх выканаў, і з таго часу ніякіх даручэнняў ад гаркома не атрымлівае. Тав. Раманава, кандыдат у члены гаркома (працуе на фабрыцы імя Кагановіча), таксама заяўляе, што апрача наведвання пленумаў яе гарком партыі ў штодзённую партыйную работу не ўцягвае.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

СПАБОРНІЦТВА БАЦЬКІ З СЫНАМ

Напярэдадні выхаду ў поле ордэнаносец Юхневіч Мацвей Сцяпанавіч аднаго разу сказаў свайму сыну.

— Ты, Віктар, у сёлетнюю вясну павінен паказаць узоры стахановскай работы на полі.

— У гэтым, бацька, можаш быць упэўнены, — адказаў з усмешкай 23-гадовы стройны сын. — Я не толькі ад цябе не адстану, а думаю абагнаць.

Адказ сына выклікаў у бацькі адначасова і радасць і настарожанасць. Няёмка будзе, калі сын бацьку апярэдзіць, — падумаў Мацвей Сцяпанавіч і тут-жа дадаў:

— Я радуюся, сынок, што ты збіраешся апярэдзіць бацьку, але ведай, што бацька таксама пастараецца не здаць сваіх перадавых пазіцый.

— Паглядзім, хто будзе напярэдзе, — адказаў сын.

Так пачалося сацыялістычнае спаборніцтва на пяршынства ў палявых работах, за высокі сталінскі ўраджай, паміж бацькам і сынам. Праўда, гэта спаборніцтва спецыяльным соцдагаворам адразу афармлена не было. Затое Віктар Мацвеевіч з таго-ж часу завёў спецыяльны «сшытак штодзённага ўліку працы ордэнаносца Юхневіча Мацвея і яго сына Віктара Мацвеевіча».

***

19 сакавіка ў калгасе імя Варашылава, Тураўскага раёна, быў першы дзень выхаду ў поле. Бацька і сын прышлі на калгасны двор разам. Яны, як і ўсе калгаснікі, яшчэ ўчора ведалі, што павінны будуць рабіць: бацька атрымаў ад свайго брыгадзіра заданне баранаваць зяблёва, а сын — араць бульбянішча. Пажадаўшы адзін аднаму поспехаў у рабоце, яны паехалі на работу.

Пакалькі бацька знаходзіцца ў трэцяй брыгадзе, а сын у другой, то да канца дня яны бачыцца не маглі. Вечарам-жа сын запытаў у бацькі:

— Ну, скажы, бацька, колькі выпрацаваў?

— Выпрацаваў я не так многа, але норму сваю перавыканаў.

— На «кольві-к»?

— На 110 проц.

— А я на 120 проц., — сказаў узрадаваўшыся Віктар. Выходзіць, што сын апярэдзіў бацьку з першага-ж дня работы.

Мацвей Сцяпанавіч падышоў да сына, пахлопаў яго па плячу і ласкава сказаў:

— Радасна чуць і бачыць, сынок, толькі раю табе не захапляцца першымі поспехамі.

Гэта папярэджанне бацькі было успрынята сынам не як дакор, а як добрая парада ордэнаносца.

У той-жа дзень за вячэрай бацька з сынам парашылі расказаць аб сваім спаборніцтве ў брыгадах, каб іх ініцыятыва паслужыла прыкладам індывідуальнага спаборніцтва паміж усімі калгаснікамі й калгасніцамі. Назаўтра былі праведзены брыгадныя сходы. Каштоўнае пачынанне бацькі з сынам было падхоплена калгаснікамі з вялікім энтузіязмам. Тут-жа на сходах калгаснікі і калгасніцы выклікалі адны адных на сацыялістычнае спаборніцтва за перавыкананне норм і добраякасную работу.

Прапрацоўка і падпісанне соцдагавору, заключанага БССР з Чэрнігаўскай і Кіеўскай абласцямі, выклікалі ў калгаснікаў і калгасніц яшчэ больш энтузіязм. Рады стахановцаў палявых работ з кожным днём мырыліся. Брыгада, у якой працуе ордэнаносец Юхневіч, лічыцца зараз у калгасе стахановскай. Яна першая на два дні раней другой брыгады скончыла сяўбу зернавых і ільну і на адзін дзень пасадку бульбы.

Характэрна, што ў гэтай брыгадзе працуюць на конях тры жанчыны. Брыгадзір — таксама жанчына, высунутая на гэту пасаду толькі сёлета. Ордэнаносец Мацвей Сцяпанавіч аказвае вялікую дапамогу маладой ініцыятыўнай брыгадзіршы **Рай Вінцэсі.** Апошняя ганарыцца, што ў яе брыгадзе працуе ордэнаносец. Ганарыцца яна і сваімі жанчынамі Леўкаўцовай Галяй, Стахоўскай Філенай і Чарнушэвіч Мартай, якія не толькі не адстаюць ад мужчын, але часта апярэджваюць іх на ворыве і баранаванні.

Брыгада, у якой працуе сын ордэнаносца, таксама мае многа стахановцаў. А ва ўсім калгасе большасць калгаснікаў — стахановцы. Яны і забяспечылі сваёй адданай работай над кіраўніцтвам ордэнаносцаў старшыні калгаса Блоцкага Міхаіла і Юхневіча Мацвея поспех веснавой сяўбы. Пролетарскае свята Першае мая варашылаўцы сустрэлі поўным выкананнем плана сяўбы ранніх зернавых, ільну і бульбы. Яны не кінулі ў аймлю ні аднаго кілограма зярна ўручную і непрацуючага. Люба гляпчець зараз на маладыя, дружныя ўсходы аўса, ячменю, пшаніцы і ільну. Іх дружнасць прыцягнула ордэнаносца Блоцкага. Тав. **Гіналo** вітаў усіх калгаснікаў з перамогай у сяўбе.

Радасна і весела правялі варашылаўцы свята працоўных Першае мая. Кожная калгасная сям'я ўпрыгожыла сваю хату зеленню, партрэтамі правадыроў, лозунгамі. Сцены і печы былі пабелены вапнай. Паабапал вуліцы ўдоўж усёй вёскі пракапаны канавы і пракладзены новыя тратуары. Насупроць калгаснага клуба пабудавана высокая арка. Яна ўпрыгожана зеленню, лозунгамі і партрэтамі правадыроў.

30 красавіка ўвечары адбыўся ўрачысты сход калгаснікаў, на якім былі падведзены рэзультаты першага туру соцыялістычнага спаборніцтва ўнутры калгаса. Пяршынства трымае другая брыгада, у якой працуе ордэнаносец Мацвей Юхневіч. У спаборніцтве з сынам пяршынства заваявана таксама Мацвеем Сцяпанавічам. У сакавіку бацька зарабіў 26 працадзён, сын 25 працадзён. У красавіку бацька — 40, сын 38. Якасць работы як бацькавай, так і сынавай адзенена на «выдатна». Спаборніцтва працягваецца ў другім туры.

Р. ФРАЛОЎ.

ПАСЛЯ ПАРЛАМЕНЦКІХ ВЫБАРАЎ ВА ФРАНЦЫІ

Соцыялісты прапануюць кааліцыйны урад

ПАРЫЖ, 6 мая. (БЕЛТА). Газета «Пці парыз'ен» змяшчае інтэрв'ю з генеральным сакратаром соцыялістычнай партыі Поль Форам.

«Мы ўваходзім у народны антыфашысцкі фронт, — заявіў Фор, — і таму мы прапануем партыям народнага фронта, а таксама і комуністычнай партыі, стварэнне кааліцыйнага ўрада. Праграма апошняга ведома загадзя. Гэта — праграма народнага антыфашысцкага фронта, з якою згадзіліся радыкал-соцыялісты, комуністы і соцыялісты і якую яны абаранялі перад выбарчыкамі».

На пытанне прадстаўніка газеты, як паступяць соцыялісты ў выпадку, калі комуністы адмовяцца прымаць удзел ва ўрадзе, Фор заявіў:

«Я не думаю, каб гэта было дастатковым матывам для соцыялістычнай партыі адмовіцца ад стварэння ўрада. Соцыялістычная партыя заўсёды прапаноўвала радыкал-соцыялістам падзяліць з соцыялістамі адказнасць за ўрад. Калі-ж і радыкал-соцыялісты адмовяцца, тады соцыялістычная партыя згодзіцца адна сфармаваць ўрад».

На думку Фора, Леон Блюм з'яўляецца той асобай, на якой прэзідэнт рэспублікі павінен спыніць свой выбар у якасці кіраўніка будучага ўрада.

***

БЕРЛІН, 5 мая. (БЕЛТА). Афіцыёз фашысцкай партыі «Фелькішэр беабахтэр» лічыць, што вынікі парламенцкіх выбараў ва Францыі пацягнуць за сабой «важнейшыя вынікі не толькі для Францыі, але і для ўсёй Еўропы». На думку газеты, найбольш важным з'яўляецца той факт, што большасць французаў і ва ўсякім выпадку пераважная большасць усіх французскіх актыўных палітыкаў—прыхільнікі калектыўнай бяспаснасці.

Перад выбарамі Іспанскага прэзідэнта

ПАРЫЖ, 6 мая. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас з Мадрыда, выбары іспанскага прэзідэнта адбудуцца 10 мая.

***

ПАРЫЖ, 6 мая. (БЕЛТА). Комуністычная фракцыя іспанскіх картэсаў (парламент) апублікавала, згодна паведамлення з Мадрыда, заяву аб тым, што комуністы—дэпутаты будуць галасаваць на прэзідэнцкіх выбарах за кандыдатуру цяперашняга прэм'ера Асаньі.

ПАРЫЖ, 5 мая. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе з Іспаніі, што ў адным з раёнаў Мадрыда ўспыхнулі стыхійныя хваляванні, якія закончыліся тым, што было спалена некалькі цэркваў.

Забастоўка гандлёвага флота і суднаў кабатажнага (прыбярэжнага) плавання прадаўжаецца.

Абвешчана ўсеагульная забастоўка ў Малазе.

***

ПАРЫЖ, 6 мая. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе з Мадрыда, што ў Кадзіксе і Валядалідзе абвешчана ўсеагульная забастоўка.

КАНФЕРЭНЦЫЯ БАЛКАНСКАЙ АНТАНТЫ

ВЕНА, 6 мая. (БЕЛТА). Згодна паведамленняў з Белграда, у парадку дня канферэнцыі Балканскай Антанты (канферэнцыя міністраў замежных спраў Турцыі, Румыніі, Югаславіі і Грэцыі), засядаўшай 4 і 5 мая, стаялі наступныя пытанні 1) прапанова Турцыі адносна ўмацавання Дарданел і ў сувязі з гэтым прынцыповае пытанне аб адносінах да змены пасляваенных дагавораў; 2) магчымасці задавалення патрабавання Балгарыі аб узбраеннях і аб прадастаўленні ёй выхаду да Эгейскага мора; 3) абмеркаванне тэзісу ўрада Грэцыі адносна ўзаемных абавязацельстваў краін Балканскай Антанты.

Апрача таго, былі абмеркаваны важнейшыя пытанні міжнароднай палітыкі, у прыватнасці вынікі рэмілітарызацыі Германіяй Рэйнскай зоны і адмаўлення ад лакарнскага дагавору, італа-абісінская вайна і праблема санкцый, парушэнне Аўстрыяй сенжэрменскага дагавору, аўстрыйская праблема ў сувязі са стварэннем італа-аўстра-венгерскага блоку і пагроза аншлюсу.

Згодна вестак, гэтыя-ж пытанні будуць стаяць у парадку дня канферэнцыі Малой Антанты ў Белградзе.

Апублікаванае пасля першага дня канферэнцыі Балканскай Антанты паведамленне падкрэслівае, што перагаворы вяліся «ў атмасферы шчырага ажыццяўлення ідэі Локарна». У якасці канкрэтнага выніку канферэнцыі ў камюніке адзначаецца аднадушная згода краін Балканскай Антанты з пазіцыяй Турцыі па пытанню аб Дарданелах, аб чым урады Румыніі, Югаславіі і Грэцыі

Наперад толькі наперад

ХАБАРНІК

(ПІСЬМО НАСТАЎНІКА)

Старшыня Дрычынскага сельсавета (Смілавіцкі раён) Жук Лявон доўга піў і гуляў з чубараўцамі ў вёсцы Сечча, але дзякуючы «Звязде» чубараўцаў разагналі, даўшы ім па заслугах.

Жук таксама прымаў удзел у гэтай справе, папаў на лаву падсудных і атрымаў 6 месяцаў прымусовай працы. Аднак, гэта для яго не паслужыла ўрокам.

Жук зноў бярэ хабар з жыхароў вёскі Сечча, п'янствуе ў Крывашэя Радзівона (былога падпрапаршчыка).

Ён разам з старшынёй калгаса «Сечча» Шыманцом паставіў Крывашэя касірам калгаса. Жук забараніў калгасам вывозіць школьныя дровы, і яны засталіся гнісці ў балоце.

МАКАРЭВІЧ.

***

СМІЛАВІЧЫ. (Ад спец. карэспан. дзнта «Звязды»). За апошні час у рэдакцыю «Звязды» паступіла 10 пісем, у якіх селькоры ўказвалі, што старшыня Дрычынскага сельсавета Жук сістэматычна п'янствуе з класава-варожымі элементамі, бярэ хабары, зажымае крытыку і інш.

Праверкай на месцы ўстаноўлена, што Ляпіч Кірыл з вёскі Сечча, Дрычынскага сельсавета, пазбаўлены выбарчых праў, вычышчаны з калгаса «Сечча», быў абкладзен сельскагаспадарчым падаткам у 1935 годзе на суму 600 рублёў, культ-жылзборам — 697 руб. 26 кап. і самаабкладаннем у 1.200 руб. Каб зменшыць падатак і ўступіць зноў у калгас, Ляпіч даў Жуку хабар парасё. Жук без пасяджэння прэзідыума сельсавета зніжае Ляпічу сельскагаспадарчы падатак да 348 руб., самаабкладанне—да 166 руб. А калі Ляпіч даў Жуку другое парасё, то апошні зноў знізіў падатак, палічыўшы ўсяго 46 руб. 25 кап.

Жук стольк раз зніжаў і павялічаў Ляпічу падаткі, што апошні і на сённешні дзень не ведае, колькі яму плаціць.

Жук за сяпа адмяніў пастанову пленума Дрычынскага сельсавета аб продажу маемасці купачкі Крывашэй.

Выпускаць насценгазету ў калгасе «Сечча» Жук забараніў, гаворачы, што «газета не адпавядае свайму прызначэнню». Гэта ў той час як насценгазета крытыкавала пасобных людзей і зусім правільна ўздымала цэлы рад хвалюючых пытанняў. Зараз насценгазета ў калгасе не выходзіць. Жук страціў твар камуніста, грамадзяніна Совецкага Саюза.

Жук, грубя парушаючы совецкія законы, стаў у асабістых карыслівых мэтах ў абарону класава-варожых элементаў.

Зажымшчык крытыкі і самакрытыкі, хабарнік не можа быць у радах партыі — быць старшынёй сельсавета.

І. БАРАНОЎСКІ.

МЕДПУНКТЫ АДКРЫТЫ... НА ПАПЕРЫ

(Пісьмо служачага)

Беларуская промстрахкаса ў пачатку гэтага года заключыла з НКАЗдароўя дагавор на адкрыццё 23 медпунктаў непасрэдна на торфараспрацоўках. Згодна дагавору, медпункты павінны быць забяспечаны кваліфікаванымі медычнымі кадрамі і медыкаментамі.

Сезон торфараспрацовак пачаўся, а некаторыя раённыя органы аховы здароўя і НКАЗ ніяк не абяруцца адкрыць медпункты. У выніку буйныя торфаарцелі — імя Дзяржынскага, імя Варашылава, «Зара рэволюцыі», «Ударнік» (Менскі раён), «Чырвоны партызан» (Смілавіцкі раён), імя Сталіна (Смалявіцкі раён) — да гэтага часу не забяспечаны медычнай дапамогай.

МУСІН.

ХТО ДАЎ ПРАВА?

(Пісьмо рабочых)

Адміністрацыя Менбуда пры вярбоўцы рабочых на будаўніцтва заключыла з імі ў лютым гг. дагавор. У дагаворы ўказвалася, што інтэрнат будзе ўтульным і добра абсталяваным, рабочыя па месцу працы будуць забяспечаны снеданнем, абедам і вячэрай.

Аднак, адміністрацыя дагавору не выканала. У інтэрнаце пануе антысанітарыя. Сталовая знаходзіцца на адлегласці 2 кілометраў. Снеданні і вячэры не гатуюцца.

Хто даў права адміністрацыі парушаць дагавор?

ЛАЦІНІК, ЖУК, СУКАЎ, ШЛЯХЦІН.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

«У ПАГОНІ ЗА ДУТЫМІ ПАКАЗАЛЬНІКАМІ»

Сакратар фабкома фабрыкі імя Куйбышэва (Менск) паведаміў рэдакцыю, што факты, указаныя ў заметцы «У пагоні за дутымі паказальнікамі», пацвердзіліся. Гэта заметка прапрацавана на групавых вытворчых нарадах. На прапанове парткома дырэкцыяй фабрыкі была праведзена спецыяльная адміністрацыйна-тэхнічная нарада па абгаварэнню ўказаных у заметцы фактаў. Прыняты канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі недахопаў. Дырэкцыі прапанавана прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці вінаватых у згубе дакументаў па ўчоту выпрацоўкі ў групе абсацаў, а таксама наладзіць пастаноўку ўліку выпрацоўкі норм.

У СЕЛЕКТАРА

Е. П. ВІЛЕТНІКАВА.

Дыспетчэр Гомельскага аддзялення Заходняй чыгункі, узнагароджаная ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга.

У пачатку 1934 года палітупраўленнем Наркамата Шляхоў Зносін быў абвешчан партыйна-камсамольскі прызыў да селектара. Я пажадала пайсці на гэты адказны ўчастак. Палітаддзел аддзялення мяне паслаў у Маскву на дыспетчэрскія курсы. 7 месяцаў займалася. За выдатную вучобу і ўзорную вытворчую практыку, палітупраўленне мяне ўзнагародзіла значком ударніка сталінскага заклiку.

У жніўні 1934 года я стала самастойна працаваць дыспетчэрам. Цяжка было працаваць у першы час. Мяне не хацелі прызнаваць, жанчына-ж ніколі не была калі селектара.

Мне крыўдна было, але-ж духам не падала. Апрача дзяжурстваў за селектарам свой вольны час я аддавала вывучэнню ўчастка і людзей, дзяжурных па станцыі, іх змены, стрэлачнікаў, грузчыкаў і інш. Часта бывала ў кандуктарскім рэзерве на вытворчых нарадах. Першая ўзяла шэфства над кандуктарскай зборнай брыгадай Барэйшы. Гэта быў самы стары кандуктар. Ён дрэнна працаваў і над ім насміхаліся. Я з ім прапрацавала правілы тэхнічнай эксплаатацыі. Не раз суправаджала сумесна з ім поезд. Зараз гэта брыгада стала вадзіць паезды ўдваіх замест ранейшых трох.

Майму прыкладу наследвалі ўсе дыспетчэры. Над кожнай кандуктарскай брыгадай пачаў шэфствацъ дыспетчэр. У рэзультаце 15 брыгад абвясцілі сябе ўтафінсвімі.

Па маёй ініцыятыве былі наладжаны выезды на адстаючыя станцыі аддзялення (Касцюкоўку, Салтанаўку, Дземахі і інш.). Там мы знаёміліся са становішчам станцыі, стрэлкамі, станцыйнымі памяшканнямі, сігналамі, грамадскай работай, праводзілі вытворчыя нарады, давалі парады. Пасля нашых паездак станцыі ўсім зменілі свой твар. Касцюкоўка стала адной з лепшых станцый аддзялення. Салтанаўку ператварылі ў комсамольска-маладзёжную станцыю, арганізавалі палітшколу.

Была яшчэ адна перашкода. Мяне не хацелі прызнаваць суседнія аддзяленні (Чэрнігаў і Жлобін) і вузлавыя станцыі гэтых аддзяленняў. Я пачала вясці барацьбу з супяжніцтвам, склокамі і з умысным затрыманнем вагонаў. Сама выязджала да начальнікаў аддзяленняў і ў палітаддзел. Прысутнічала на дыспетчэрскіх нарадах гэтых аддзяленняў. Па маёй ініцыятыве былі наладжаны выезды брыгад Гомельскага аддзялення да суседзяў для ліквідацыі недахопаў у рабоце.

Пры ўступленні на дзяжурства змена наша заключала сацыялістычны дагавор па кожнай станцыі на хутчэйшую пагрузку, скарачэнне стаянкі зборных паяздоў, павелічэнне пільнасці ў часе руху і інш.

У маёй змене не было ні аднаго выпадку затрымання паяздоў па ўсіх станцыях.

Адстаючыя да гэтага часу станцыі вышлі ў перадавыя. Выраслі і людзі гэтых станцый.

Усе паказальнікі: камерцыйная хуткасць, процант следвання паяздоў па раскладу і інш. па маёй змене лічацца найлепшымі па ўчастку. Камерцыйная хуткасць даведзена да 30,2 кілометра ў гадзіну пры заданні ў 24,6 проц. Прастой вагонаў па 18 станцыях даведзен да 5,5 гадзіны пры заданні ў 6,9.

8 сакавіка я прымала ўдзел на ўрачыстым пасяджэнні ў маскоўскім Вялікім тэатры, прысвечаным Міжнароднаму жаночаму дню. У прэзідыуме былі таварыш **Сталін** і таварышы **Орджанікідзе, Кагановіч, Дзімітраў, Хрушчоў.** Я заслужыла вялікі гонар на гэтым урачыстым пасяджэнні вітаць ад імя чыгуначнікаў вялікай краіны стахановак і стаханаўцаў Масквы. Пасля да мяне падышоў Лазар Майсеевіч і спытаў у мяне, аб маёй рабоце. На развітанне паціснуў мне руку і пажадаў далейшых поспехаў.

Пажаданні Лазара Майсеевіча паслужаць для мяне праграмай у маёй рабоце. Я абавязваюся сваю змену ператварыць у стаханаўскую. Начальнікі станцыі, вітаючы мяне са ўзнагародай, абавязаліся яшчэ лепш працаваць, каб наша змена стала адной з першых па ўчастку.

Буду змагацца за ўзорнае дэпо

А. П. ЕГОРАЎ

Начальнік паравознага дэпо Віцебск, узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга.

На працягу доўгіх гадоў Віцебскае паравознае дэпо лічылася самым горшым па МБВ чыгункі.

З таго часу, як на транспарт прыйшоў Лазар Майсеевіч Кагановіч, работа дэпо пачала сістэматычна паляпшацца. Зараз дэпо з'яўляецца адным з перадавых. Канчаткова ліквідавана недадача паравозаў пад паязды. Сярэдні рамонт паравоза працягваецца 9—10 дзён замест нормы 12 дзён. Разам зніжан прастой паравозаў у прамывачным рамонце. Тэхнічная хуткасць паравозаў павышана да 37,3 кілометраў у гадзіну пры заданні 33,7 кілометраў. На працягу апошніх 3-х месяцаў дэпо адправіла 255 важкіх паяздоў ад 1.750 да 2.800 тон пры сярэдняй тэхнічнай хуткасці ў 33 кілометры ў гадзіну.

Гэтыя поспехі з'яўляюцца рэзультатам разгортвання стахановска-крываносаўскага руху ў нашым дэпо. Машыністы **Зіновіч (узнагароджаны ордэнам Леніна), Гутаровіч, Мізіш, Башкоў, Салаўёў, токар Кезлоў** (узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга), **слесар Пушкарскі** — вось яны ініцыятары стахановскага руху нашага дэпо, героі рэкордных тэмпаў і высокай якасці. Іхнімі метадамі зараз працуе 812 чалавек.

Мы ўмацавалі кіраўніцтва асобнымі вытворчымі звеннямі. На кіруючую адміністрацыйна-гаспадарчую работу вылучылі найбольш кваліфікаваных таварышоў. Асабіста я большую частку рабочага часу аддаю аператыўнай рабоце непасрэдна на вытворчасці.

Для таго, каб спрыяць павышэнню тэхнічнай хуткасці, мы прыступілі да агляду і рамонту таварных паравозаў.

Мы паставілі перад сабою задачу зрабіць дэпо культурным прадпрыемствам. Для гэтага зараз праводзім пабелку цэхаў, афарбоўку абсталявання, рамонт слясарных ціскоў і інструменту.

Тав. Кагановіч паставіў перад транспартам, як адну з цэнтральных задач, канчатковую ліквідацыю крушэнняў і аварый. Віцебскае дэпо крушэнняў не мела, але былі асобныя выпадкі парушэнняў правіл тэхнічнай эксплаатацыі (праезд закрытых семафораў, абрывы паяздоў). Каб канчаткова ліквідаваць гэтае зло, мы зараз праводзім праверку тэхнічных ведаў машыністаў, арганізуем курсы паравозных брыгад для павышэння кваліфікацыі машыністаў, памочнікаў і качагараў, паляпшаем якасць тэхнічнай вучобы ўсіх рабочых нашага дэпо.

Я заслужыў высокага гонару. Урад узнагародзіў мяне ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга. Такая высокая ўзнагарода абавязвае мяне яшчэ больш палепшыць кіраўніцтва вытворчымі ўчасткамі ў дэпо, змагацца за сапраўды ўзорную работу, за перадавое месца дэпо па МБВ чыгункі.

МАШЫНІСТ-СТАХАНАВЕЦ



Арэстаў Леанід — старшымашыніст стахановскага паравоза Э-4196 (Менск)—ініцыятар ваджэння важкіх паяздоў, сістэматычна перавыконвае тэхнічную і камерцыйную хуткасць.
НА ЗДЫМКУ: т. Арэстаў дае ход паравозу. Фота Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

ДЗЯКУЙ СТАЛІНУ

Л. Л. БАЙКАЧОЎ

Машыніст жлобінскага паравознага дэпо, узнагароджаны ордэнам Леніна.

Падручным слесара паступіў я ў 1918 годзе ў жлобінскае паравознае дэпо. Недалёка быў фронт. Белапалякі наступалі на маладую Совецкую Беларусь. Праз Жлобін праходзілі эшалоны Чырвонай арміі. Суправаджаць паязды не капала паравозных брыгад. Я прапанаваў свае паслугі весці вайсковыя саставы. Прапанова была прынята. Упершыню ўступіў я тады на паравоз і застаўся на ім працаваць памочнікам машыніста.

З таго часу многа вады ўцякло. Стаў я машыністам і дапамог многім рабочым павысіць кваліфікацыю. За добрасумленную і ўзорную работу ўрад узнагародзіў мяне ордэнам Леніна.

Мой паравоз ніколі не меў аварый і крушэнняў. Я яго старанна даглядаю, таму і працуе ён бездакорна.

Калі ў краіне пачало разгортвацца ўдарніцтва, я адзін з першых па дэпо быў у ліку ўдарнікаў сацыялістычнай працы. Я дакладна размеркаваў абавязкі паміж асобнымі членамі брыгады і дабіўся своечасовага выдзялення паяздоў па раскладу, эканоміі апалу, узорнага ўтрымання паравоза.

Але звязвалі рукі ўстаноўленыя нормы. Хацелася хутчэй весці паязды, хацелася больш вагонаў узяць, але гэтага нельга было рабіць, бо ўстаноўленыя нормы лічыліся законам і той, хто парушаў іх, прадаваўся ў суд.

Калі следам за Стахановым машыніст Крыванос нанёс удар «тэорыі прэдзелу» і пачаў вадзіць паязды в больш высокай тэхнічнай хуткасцю, я са сваёй брыгадай (памочнік Бікарэвіч, качагар Булкоўскі) першым у дэпо прымяніў яго метады.

На кастрычніцкія святы мінулага года мяне паслалі ў Менск. Нас тады прынялі тав. Гікало. У сваім выступленні я абяцаў тав. Гікало, прыехаўшы дамоў, яшчэ лепш працаваць і вадзіць важкія паязды.

Вярнуўшыся ў дэпо, я патрабаваў сфармавання важкага поезда. Кансерватыўны элемент аднёсся недаверліва. Але я настояў на сваім. Сфармавалі поезд на 130 тон вышэй нормы. Суправаджаць яго паехаў са мною памочнік начальніка дэпо, старшыня мясцкома і рэвізор руху. Першы важкі поезд я прывёў на станцыю прызначэння на 22 мінуты раней часу, канчаткова пераканаўшы кансерватараў, што ёсць поўная магчымасць перавысіць нормы вагі паяздоў. Калі мы вярнуліся да сябе ў дэпо нам арганізавалі ўрачыстую сустрэчу. Машыністы падымаліся на паравоз, аглядалі яго, пыталіся, як ішла машына і інш. На сходзе паравознікаў я выступіў і расказаў аб сваім вопыце.

— Галоўнае, ведаць машыну, добра даглядаць яе, а ў дарозе быць пільным, чуткa і акуратна выконваць свае абавязкі, ведаць профіль шляху. На тым-жа сходзе я выклікаў на спаборніцтва рад машыністаў. Выклік яны прынялі. У мяне пыталіся, як весці поезд на пад'ём, як весці з ухілу і інш. На ўсе запытанні я даў вычарпальны адказ. Ужо назаўтра 5 паравозных брыгад павялі важкія паязды. З кожным днём колькасць іх расце.

Першым па дэпо пачаў я вадзіць і паязды без астаноўкі на чыстку топак і набор вады. Тэхнічнае становішча майго паравоза добрае. Прамывачны рамонт па плану павінен праводзіцца пасля прабегу 3.000 кілометраў, а я стаўлю ў рамонт толькі пасля 5.000 кілометраў прабегу. За безаварыйную язду я ў мінулым годзе атрымаў наркомаўскую прэмію.

Вось за ўсю гэту работу я заслужыў высокую ўзнагароду — ордэн Леніна.

Я толькі што вярнуўся з сталіцы нашай вялікай радзімы — з Масквы. Прымаў там удзел у работах галіннай канферэнцыі паравознікаў, а потым прысутнічаў на прыёме ў кіраўнікоў партыі і урада. Няма слоў, каб перадаць усе тыя ўражанні, якія я атрымаў. Сустрэчы гэта застанецца ў маёй памяці на ўсё жыццё.

Пасля работы галіннай канферэнцыі нам раздавалі падарункі. Я асабіста атрымаў патэфон з пласцінкамі.

Дамоў штодзенна я атрымліваю віншаванні, прывітальныя пісьмы і тэлеграмы. Прыслаў тэлеграму стрычны брат інжынер Кліцуноў, які працуе на Урале, сын — баец Далёкаўсходняй Чырвонай арміі, рэдакцыя газеты «Гудок» і інш.

Радасна жыць і працаваць у нашай краіне. І ўсё гэта дзякуючы вялікаму правадыру і другу працоўных таварышу Сталіну, дзякуючы нашай большэвіцкай партыі, якая мяне, кандыдата ў члены партыі, штодзенна выхоўвае. І калі партыя патрэбуе, я ў любую мінуту перасяду на бронепоезд і павяду яго на апошні штурм капітала.

ПРАЦУЮ З КОЖНЫМ ЧАЛАВЕКАМ

А. Ф. БАРОЎСКАЯ.

Дзяжурная па станцыі Васілевічы, Заходняй чыгункі, узнагароджаная ордэнам «Знак почета».

1 мая споўнілася 5 год, як я працую дзяжурнай па станцыі Васілевічы.

Начальнік станцыі Галявіцы — чалавек старога духу—быў вельмі здзіўлен, калі я прыехала работаць дзяжурнай. Як гэта дзяўчына стане дзяжурнай?

Пасля 9-месячнай практыкі мне за добрую работу далі павышэнне — перавялі на большую станцыю—Шпіч, а ў 1933 г. прызначылі дзяжурнай на станцыі II класа Васілевічы.

Тут я зноў сустрэлася са старымі поглядамі. Стрэлачнікі заявлялі: «У нас мужчыны не спраўляюцца з работай, а ты тым больш».

Я рашыла перш азнаёміцца з работай станцыі.

Адначасова з гэтым я разгарнула масавую работу сярод людзей станцыі. Пачала праводзіць тэхнічную вучобу. У маёй змене ўсе работнікі здалі тэхэкзамен на «выдатна». Стрэлачніка Дайко Сямёна я абучыла на сцэпшчыка.

Пры азнаямленні з работай станцыі я сустрэлася з такім з'явішчам: стрэлачнікаў лічылі ўдарнікамі за тое, што яны часта падмяталі месца вакол стрэлкі, у той час калі сама стрэлка была забруджана мазутам. Я мабілізавала хатніх гаспадынь і разам з імі ачысціла стрэлку так, што яна аж блішчэла, паказалі стрэлачнікам як патрэбна прыбіраць. Былі незадальненні. Старык стрэлачнік Перакоп гаварыў: «30 год я працую на стрэлцы, а вы мяне вучыць збіраецеся як чысціць стрэлку». Я рашыла з ім асобна заняцца. Неаднаразова хадзіла да яго на-дом, растлумачвала як патрэбна выконваць свае абавязацельствы. Старык зразумеў сваю неправату і аднойчы на сходзе заявіў: «Не люблю, каб жанчыны хадзілі да мяне вучыць, але-ж сваю стрэлку даглядаю на «выдатна». Стрэлачнік Перакоп зараз адзін з лепшых стаханаўцаў.

1 кастрычніка мінулага года я ўдзельнічала на дарожным злёце стаханаўцаў-крываносаўцаў у Калуге. Прыехаўшы дамоў, прапрацавала на зменах мэтэрыялы злёта. Пасля гэтага яшчэ больш узнялася хваля стаханаўскага руху на нашай станцыі. Сваю змену я ператварыла ў стаханаўскую. Прастой вагонаў мы давялі да 5—4,5 гадзіны, замест ранейшых 6,5. У сакавіку я давяла прастой да 4,2 гадзіны. Па транзіту мы дабіліся зніжэння прастою да 1,9 гадзіны пры заданні ў тры гадзіны. Раней прастоі даходзілі да 8,5 гадзіны. Зараз у нас налічваецца 62 стаханаўцы, 4 стаханаўскіх брыгады грузчыкаў.

На дзяжурства я прыходжу на час раней. чытаю газеты са зменай, потым коратка абгаварваем прадстаячую для нас работу. Пасля гэтага іду разам са стрэлачнікам аглядаць пасты, стрэлкі і тады толькі прымаю дзяжурства.

Працую ўвесь час без аварый. За ўзорную работу я атрымала значок ударніка сталінскага заклiку, некалькі раз прэміравана. Узнагарода ордэнам «Знак почета» абавязвае мяне яшчэ лепш працаваць. Для мяне ясна адно, што і на маленькіх станцыях можна дасягнуць вялікіх рэзультатаў і тварыць гераічныя справы.

ЗА 10 ТЫСЯЧ КІЛОМЕТРАЎ БЕЗ ПРАМЫЎКІ

А. Н. НІКІЦІН

Машыніст Гомельскага дэпо, узнагароджаны ордэнам «Знак почета».

Нам, маладым машыністам, звычайна не давяралі паравоз, не верылі ў нашы сілы.

— На першы час папрацуй на маламоцным паравозе С, а там паглядзім, — сказаў мне начальнік паравознага дэпо.

Я не пакрыўдзіўся, рашыў, што трэба практыкавацца і даказаць справай. Некалькі месяцаў вадзіў таварныя паязды на гэтым паравозе. Ва ўсесаюзным спаборніцтве машыністаў я заняў першае месца па раёну, за што быў прэміраван граматай і грашыма.

— Заслужыў, Саша, паравозік пябе на паравоз Щ-3145, — віншаваў мяне начальнік дэпо. Але-ж некаторыя старыя машыністы пагаварвалі:

«На малым паравозе ўсякі здолее дабіцца добрых рэзультатаў, няхай папрабуе на гэтым». І я даказаў, што і з магутным паравозам магу справіцца.

У 1934 годзе ў нашым дэпо дрэнна працаваў пасажырскі паравоз С-263. Ён меў вялікія спажыванні. перажог паліва. Трыкутнік дэпо рашыў перадаць гэты паравоз комсамольцам. Да 1 мая я яго атрымаў. Працаваў, я на гэтым паравозе 1 год і 8 месяцаў, не ведаў ні аднаго спынення. Паравоз мой даваў эканомію паліва. За ўзорную работу я атрымаў грамату ад урада БССР і ад кіраўніцтва дарогі са званнем лепшага машыніста.

Многія машыністы ў дарозе тармозяць так, што пасажыры аж падскакваюць. Я-ж пачаў тармажу, спыняю поезд без малейшага штуршка.

Былі ў мяне такія небяспечныя минуты, калі здавалася, што крушэнне немінуча, але-ж ніколі я не прыходзіў у замяшанне і гэтым унікаў крушэння. Моцна запомніліся мне такія факты: я вёў поезд з Гомеля ў Бранск. Пад'язджаю да станцыі, семафоры адкрыты, лінія свабодная. Толькі за 20 метраў заважыў, што іду на другі састаў. Патрабавалася выключная энергія, каб унікнуць крушэння. Другі выпадак. На станцыі Жлобін-Пасажырская семафор быў адкрыт на праезд да таварнай станцыі. Дзяжурны махае мне белым сігналам — гэта азначала цішэй. Я рашыў, што ён хоча пасадзіць свайго пасажыра і закрыў пару, паколькі быў дан сігнал, а тормаза не трымаў, бо баяўся абрыву. Пад'язджаю бліжэй. Раптам дзяжурны дае мне чырвоны сігнал — тарміновая астаноўка і крычыць: «Трымай поезд, едзеш у бок другога састава». Я прыняў усе меры да астаноўкі і толькі на адлегласці 50 сантыметраў, удалося астанавіць поезд.

Многія комсамольцы з майго паравоза перайшлі на другія машыністамі. Комсамолец Елкін Яўгені, мой памочнік, вытрымаў экзамен на машыніста, і я яму здаў свой паравоз, калі мяне перавялі на пасажырскі. Зараз ён водзіць важкія паязды. Ванцоў Іван, Зуйкоў Владзімір таксама сталі машыністамі.

Як я думаю ў далейшым арганізаваць сваю работу? Я прасіў, ужо адміністрацыю дэпо, каб мне дазволілі павялічыць аб'ём тэндэра для большага ўмяшчэння паліва. Гэтым мы дасягнем, што паравоз не будзе заходзіць у дэпо ад прамыўкі да прамыўкі і мы зможам абслугоўваць паязды наскроз ад Менска да Бахмача, не адчапляючыся ў Гомелі.

Я буду дабівацца паступовага павелічэння міжпрамывачнага прабегу паравоза. Спачатку я паставіў перад сабою задачу, каб мой паравоз рабіў ад прамыўкі да прамыўкі 7 тысяч кілометраў, а затым давяду прабег да 10 тысяч. Я гэтага дабюся.

КНІГА АБ ГЕРОЯХ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі выпусціла з друку першыя 500 экземпляраў кнігі «Ордэнаносцы сельскай гаспадаркі БССР».

Гэта цудоўная кніга з'яўляецца яркай гісторыяй барацьбы нашай партыі за выхаванне і выпрацоўванне самага каштоўнага ў савецкай краіне капітала — людзей.

«Працоўны чалавек адчувае сябе ў нас свабодным грамадзянінам сваёй краіны, свайго роду грамадскім дзеячом. І калі ён працуе добра і дае грамадству тое, што можа даць, — ён герой працы, ён авеян славай».

Гэтыя словы таварыша **Сталіна** вычэрпваюча характарызуюць грамадскую прыроду гераізму і савецкіх людзей. Такіх герояў, якіх мае і многа будзе мець наша краіна, ніколі не будзе ў капіталістычных краінах, бо там праца з'яўляецца справай прыватнай, асабістай. Толькі савецкі лад, лад сацыялізма прабудаваў захаваныя ў народзе сілы і заклікаў іх да жыцця, да творчасці («Правда»).

Героі калгасных палёў — перадавікі ўраджайнасці, ільнаводы, жывёлаводы — расказваюць, як яны пад кіраўніцтвам ленінска-сталінскай партыі, пад вадзіцельствам вялікага **Сталіна** заваявалі бліскучыя поспехі ў сваіх калгасах і саўгасах.

Лепшыя людзі БССР дзеляцца сваімі ўражаннямі аб незабыўных днях пробывання ў Маскве, аб сустрэчы з кіраўнікамі партыі і ўрада, аб сустрэчы з вялікім **Сталіным.**

Машыніст малатарні «МК 1100» Хойніцкай МТС тав. **Свірыд Кандрат Ефімавіч** даў абяцанне таварышу Сталіну намалаціць у 1936 годзе 1.500 тон. Калі я ў Маскве ўбачыў нашых кіраўнікоў,— расказвае тав. Свірыд, — убачыў таварыша **Сталіна** — я так ўзрадаваўся, што амаль не заплакаў. Я сказаў таварышу Сталіну, што вымалачу 1.500 тон, і калі я вышаў з Крэмля, мне здавалася, што мне не 55 год, а 30, я проста памаладзеў.

Расказ кожнага ордэнаносца насычан яркімі, праўдзівымі фактамі аб заможным жыцці, шчасці, знойдзеных у калгасе.

Кніга «Ордэнаносцы сельскай гаспадаркі БССР» — яркі паказ таго, якія велізарныя магчымасці тояцца ў савецкай сістэме, у нашых людзях, якія глыбокія і невычарпальныя крыніцы талентаў і дараванняў ёсць у народзе, як вялік і глыбок рэвалюцыйны запал герояў сацыялізма.

„ВАРАШЫЛАЎСКІЯ КАВАЛЕРЫСТЫ"

Поўэскадрон варашылаўскіх кавалерыстаў з калгаснікаў і калгасніц Шумілінскага, Дабейскага, Лаўжанскага, Жарабіцкага, Пагарэліцкага сельсоветаў, Сіроцінскага раёна, на першамайскай дэманстрацыі ў Сіроціне.

А. МАНЬКОЎ.

УРАЧЫСТАЕ АДКРЫЦЦЕ АРШАНСКАГА АЭРАКЛУБА

ОРША, 7 мая. (БЕЛТА). 5 мая адбылося ўрачыстае адкрыццё нова-пабудаванага аршанскага аэраклуба, які з'яўляецца адным з лепшых у БССР.

З рапартамі аб сваёй абарончай рабоце выступілі вучлёты, парашутысты, варашылаўскія стралкі, юныя авіямадэлісты, атрад процівапаветранай хімічнай абароны. Аршанскіх асоавіяхімаўцаў вітаў старшыня ЦС Асоавіяхіма БССР тав. Мілонаў, сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Аўгустайціс і іншыя.

368 прадпрыемстваў і калгасаў Аршаншчыны з'яўляюцца юрыдычнымі членамі аэраклуба. 53 чалавекі без адрыву ад вытворчасці рыхтуюцца на вучлётаў. Выпушчана 36 планерыстаў і рыхтуецца да выпуску яшчэ 116 чалавек. У гуртках юных авіямадэлістаў займаецца 372 чалавекі. Аэраклуб выклікаў на спаборніцтва на лепшую арганізацыю работы аэраклубы Менска, Віцебска, Гомеля, Магілева і Бабруйска.

Пад бурныя апладысменты прысутных на ўрачыстым сходзе пасланы прывітальныя тэлеграмы таварышам **Сталіну, Варашылаву** і **Гікало.**

У гэты-ж дзень было ўрачыстае адкрыццё помніка Леніну, пабудаванага на пляцоўцы аэраклуба. На мітынгу прысутнічала больш пяці тысяч чалавек.

ЗАПІС МЕЛОДЫЙ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ПЕСЕНЬ

Група студэнтаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі па заданню фальклорнай камісіі Беларускай Акадэміі Навук выехала ў Мазырскую і Полацкую акругі для запісу мелодый беларускіх народных песень. Студэнты прабудуць у раёнах каля двух тыдняў і наведаюць рад калгасаў. Увесь сабраны матэрыял будзе перададзены фальклорнай камісіі для апрацоўкі.

КУРСЫ КАЛГАСНІКАЎ-ВЫНАХОДЦАЎ

Цэнтральны Совет вынаходцаў БССР арганізуе з 1 чэрвеня ў Менску аднамесячныя курсы для калгаснікаў-вынаходцаў, на 20 ч. Сярод іх вынаходцы-калгаснікі тт. Хатулёў (Суражскі раён), Бокан (Ветрынскі раён), Гарлачоў (Мсціслаўскі раён), Баброў (Пухавіцкі раён) і інш. Курсанты праслухаюць лекцыі па матэматыцы, чарчэнню, механіцы і па іншых прадметах. Адначасова ў Менску будуць працаваць аднамесячныя курсы для старшынь таварыстваў вынаходцаў пры буйнейшых прадпрыемствах рэспублікі.

ГУРТОК «ВАРАШЫЛАЎСКІХ КАВАЛЕРЫСТАЎ»

ДЗЯРЖЫНСК. У калгасе «Чырвоны партызан», Бароўскага сельсовета, арганізаван гурток «варашылаўскіх кавалерыстаў». У гурток залічалася 15 чал. з іх 8 дзяўчат. Для заняткаў гуртка праўленне калгаса вылучыла шэсць самых лепшых коней.

М. ГАРМАЗА.

БУДАЎНІЦТВА Ў РАЁНЕ

ЦЕРАХОЎКА. У калгасе «Вольная праца», Гардуноўскага сельсовета, пачата будаўніцтва механічнай майстэрні па вырабу вулляў, якая штогод будзе выпускаць 5 тысяч вулляў. Для майстэрні закуплен рухавік.

У раённым цэнтры пачата будаўніцтва стадыёна. Закончана пасадка новага парку на плошчы ў два гектары.

В. ГАНІН.

АЭРОБНАЯ МОЧКА КАНАПЕЛЬ

Беларускі навукова-даследчы інстытут прамысловасці заключыў дагавор з аддзелам пенькаводаў галоўнага кіраўніцтва пенькаджутавай прамысловасці Наркамлегпрома СССР на праектаванне і кансультаванне будаўніцтва ў гатым годзе першай вопытнай установкі па аэробнай мочцы (штучнае дажджаванне) каналель па метаду інстытута пры Пачынкаўскім пеньказаводзе, Горкаўскага края.

РЭДКАЯ АПЕРАЦЫЯ СЭРЦА

БАРЫСАЎ, 7 мая. **(Па тэлефону).** Аперацыя на сэрцы і сардэчнай сарочцы адносіцца да ліку выключна рэдкіх і складанейшых аперацый у хірургіі. Раны сэрца пераважна выклікаюць хуткую смерць.

28 красавіка, у 3 гадзіны ночы, у хірургічнае аддзяленне 1-й совецкай бальніцы ў г. Барысаве быў дастаўлен слесар будаўнічага ўчастка № 74 Сазонаў Канстанцін, у якога было нажавое раненне сэрца. Хворы быў без пульсу, у беспрытомнасці.

Загадчык хірургічнага аддзялення бальніцы ўрач Сегаль зрабіў хвораму экстраную аперацыю. Аказалася, што раненне каля сардэчнай сарочкі. Апошняя была напоўнена крывёй, якая здаўляла сэрца і не давала яму магчымасці працаваць. Работа сэрца ўгасала. Урач быстра выдаліў у хворага тры рабрыны, дабраўся да сардэчнай сарочкі, выдаліў алтуль збіўшуюся кроў і зашыў сардэчную сарочку.

Хворы пачаў ажываць на вачах. У яго з'явіўся пульс, а хутка і з'явілася свядомасць. З часу аперацыі прайшло 9 дзён. Сазонаў адчувае сябе вельмі добра.

ІВАШЫН.

ГАНДЛЁВАЯ ХРОНІКА

* Наркамунутгандаль БССР з 1 мая знізіў цэны на фотаапараты. Фотаапарат «Турыст», які раней каштаваў 270 руб., зараз каштуе 213 руб., «Фотакор № 1» раней каштаваў 240 руб., зараз—170 руб.

СПАРТЫЎНАЕ ТАВАРЫСТВА «ХАРЧАВІК»

У БССР арганізуецца спартыўнае таварыства «Харчавік». 4 мая гэтага года ў Упаўнаркамхарчпроме на скліканай па гэтаму пытанню нарадзе было выбрана часовае рэспубліканскае оргбюро ў складзе 14 чал. гаспадарнікаў, старшынь ЦП саюзаў і фізкультурнікаў-выдатнікаў. Старшынёй оргбюро выбран упаўнаважаны Наркамхарчпрома СССР па БССР тав. Крылоў. На прадпрыемствах пачалася работа па стварэнню ячэек таварыства і вярбоўцы членаў.

ШМУКЛЕР.

СПАРТЫЎНАЯ ХРОНІКА

* Футбольны сезон у Менску адкрыла 6 мая ўсебеларускім стадыёне веснавым розыгрышам спартыўнае таварыства «Спартак». У розыгрышы прымае ўдзел 130 футбалістаў. У першых сустрэчах перамогу атрымалі Бабруйск над Полацкам (3:1), Віцебск над Магілевам (2:0) і Гомель над Оршай (3:0). Фінал розыгрышу адбудзецца сёння.

* Сёння ў Доме фізкультуры ў Менску адкрываюцца гарадскія спаборніцтвы па штанзе і барацьбе для навічкоў. У спаборніцтвах прымае ўдзел звыш ста маладых цяжкаатлетаў горада.

* Рэспубліканскі розыгрыш пярэдыства па боксу пачынаецца 10 мая ў Менску. У ім прыме ўдзел 8 камандз. Спаборніцтвы прадоўжацца тры дні.

Міжгарнізонныя завочныя стралкова-спартыўныя спаборніцтвы

Цэнтральны Дом Чырвонай арміі імя М. В. Фрунзе з 1 па 6 мая 1936 года абвясціў другія міжгарнізонныя спартыўна-стралковыя спаборніцтвы імя 1 мая і прадставіў аднаму гарнізону Беларускай ваеннай акругі права ўдзелу ў спаборніцтвах. Камандуючы войскамі БВА прадаставіў гэта права менскаму гарнізону.

6 і 7 мая адбыліся заліковыя стрэльбы спаборніцтваў. Стрэльба праводзілася з трох відаў зброі: баявой вінтоўкі, на адлегласці 300 метраў, стоячы з рукі па мішэні № 3 (міжнародная), 20 патронаў; дробнакалібернай вінтоўкі, на 100 метраў, па мішэні № 5,20 патронаў; рэвальвера «Наган», на 50 метраў, па мішэні № 5,20 патронаў. З кожнага віду зброі стралянула каманда на 10 чалавек лепшых стралкоў гарнізона.

З баявой вінтоўкі каманда выбіла 1.002 ачкі. Лепшыя рэзультаты паказаў старшы лейтэнант АБВШ тав. Чэрноў, які выбіў 126 ачкоў з 200 магчымых. З дробнакалібернай вінтоўкі каманда выбіла 1.623 ачкі. Лепшыя рэзультаты паказалі лейтэнант Н-скага стралковага палка тав. Гысеў — 176 ачкоў з 200 магчымых, старшы лейтэнант АБВШ тав. Чэрноў — 172 ачкі і старшы лейтэнант Н-скага стралковага палка тав. Пашенка — 171 ачко. З рэвальвера каманда выбіла 1.238 ачкоў. Лепшыя рэзультаты паказалі старшы лейтэнант АБВШ тав. Чэрноў — 140 ачкоў з 200 магчымых і старшы лейтэнант Н-скага кавалерыйскага палка тав. Варонін — 139 ачкоў.

Па ўсіх відах зброі выдзяляецца старшы лейтэнант АБВШ тав. Чэрноў. Ён паказаў выдатныя рэзультаты. Тав. Чэрноў знаходзіцца ў зборнай стралкова-спартыўнай камандзе РСЧА і з'яўляецца лепшым стралком у менскім гарнізоне.

У рабоце судзейскай камісіі прымалі ўдзел прадстаўнік харкаўскага акруговага ДЧА батальённы камісар тав. Карушкін, прадстаўнікі ЦС Асоавіяхіма БССР і ВСФК БССР. Усе мішэні высланы ў ЦДЧА, дзе будуць прагледжаны цэнтральнай судзейскай камісіяй, пасля чаго будуць абвешчаны рэзультаты і месцы гарнізонаў РСЧА, якія прымалі ўдзел у спаборніцтве.

Ал. ШПІТАЛЬНЫ.

КОТ ПРЫГНУЎ З ПАРАШУТАМ

Пры авіямадэльным габінеце гомельскага аэраклуба адкрыта экспериментальная парашутная станцыя па скідванню з парашутамі жывёлін.

Першы прыжок з вышыні 150 метраў з запяжкай у дзве секунды зрабіў кот, вагой 1 кілограм 50 грамаў. Прыжок быў зроблен на аэрадроме аэраклуба са вмея, пры дапамозе «паштальёна». Самаадчуванне ката пасля прыжка добрае. Зараз авіямадэлісты падрыхтоўваюць прыжок ката з большай вышыні і з большай запяжкай.

ЗДАРЭННІ

* **Пажар у садзе «Профінтэрн».** 5 мая, у 19 гадзін, у садзе «Профінтэрн» узнік пажар, якім быў знішчан радыёвузел і склад, дзе захоўвалася маёмасць саду. Страты ад пажару складаюць каля 30.000 руб. Папярэднім расследваннем устаноўлена, што пажар узнік ад кароткага замыкання электраправадоў. Вядзецца далейшае расследванне.

* **Няшчасны выпадак.** На борце кузава аўтамашыны 1-й совецкай бальніцы, якою кіраваў шофер Петрэнка, ехаў гр-н Семіжонаў. Ад моцнага штуршка Семіжонаў упаў на брук, папаў пад кола машыны і быў задаўлен насмерць.

ПАВЕДАМЛЕННІ

8 мая, у 2 г. дня, у партгабінеце Кагановіцкага РК КП(б)Б (Дом урада, V паверх, левае крыло, пакой 501) адбудзецца кансультацыя для агітатараў вячэрніх змен прадпрыемстваў Кагановіцкага раёна. Тэма: «Перамога народнага фронта ва Францыі».

9 мая, у 7 г. вечара, у партгабінеце кагановіцкага РК КП(б)Б (Дом урада, V паверх, левае крыло, пакой 501) будзе кансультацыя для куруткоў ВШІ і фабрыкі імя Куйбышава, прымаючых удзел у раённай тэарэтычнай канферэнцыі.

Тэма: «Вучэнне Леніна—Сталіна аб партыі».

9 мая, у 10 г. раніцы, у Доме партактыва—чарговыя заняткі семінара прапагандыстаў па гісторыі партыі, загадчыкаў партгабінетаў і семінара кандыдацкіх школ.

9 мая, у 7 г. вечара, у Доме партактыва будзе нарада загадчыкаў партгабінетаў.

ПАПРАЎКА

У № 102 газеты «Звязда» ад 6 мая ў артыкуле «Аб пастановах партыйнага схода» ў трэцяй калонцы зверху памылкова ўказана: «У Мазыры кандыдацкая група цагельнага завода....» Трэба чытаць: У Барысаве партыйная група цагельнага завода і т. д.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Беларускі дзяржаўны тэатр ВДТ-1 | 8 мая — ЯК ЯЕ ЗАВУЦЬ

Памяшканне Польскага тэатра (Савецкая, 17, тэл. 25-153) | Гастролі тэатра Чырвонай арміі ББА 8 мая В. Гусеў СЛАВА

„Чырвоная зорка" | ВЯСЁЛЫЯ РЭБЯТА

„Пралетарый" | Гукавы маст. фільм КАЛЯ САМАГА СІНЯГА МОРА

„Інтэрнацыянал" | Гукавая вясёлая камедыя СВЯТА СВЯТОГА ІОРГЕНА

Кіно „Спартак" | выдатны прыгодніцкі фільм ЗАЛАТОЕ ВОЗЕРА

Кансервы

ЗЯЛЁНЫ ГАРОШАК

НАЙЛЕПШАЕ ВЕГЕТАРЫЯНСКАЕ БЛЮДА. НЕЗАМЯНІМЫ ГАРНІР да любой стравы

ВЕЛЬМІ СМАЧНЫЯ, СПАЖЫЎНЫЯ І НЕ ПАТРАБУЮЦЬ АСОБАГА ГАТАВАННЯ.

Кансервы зялёны гарашок заўсёды ёсць ва ўсіх фірменых магазінах Саюзкансервзбыта і ў іншых прадуктовых магазінах.

Менскай канторы ЗАГОТЗЯРНА ПАТРЭБНЫ: грузчыкі.

Зварачацца: Віржавы зав. № 1, пакой 12

Беларускі дзяржаўны Медыцынскі інстытут

АБВЯШЧАЕ КОНКУРС на пасады:

ДАЦЭНТА па курсу гігіены працы і АСІСТЭНТАЎ па кафедрах: агульнай гігіены, паталагічнай анатоміі, судовай медыцыны і нервовых хвароб.

Заявы з прыкладаннем кароткай біяграфіі накіроўваць да 1 чэрвеня па адрасу:

Менск, медыцынскі інстытут.

КОГІЗ Партсектар ВЫВУЧАЙЦЕ КЛАСІКАЎ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА ПА ПЕРШАКРЫНІЦАХ

ПАТРАБУЙЦЕ Ў КНІЖНЫХ МАГАЗІНАХ КОГІЗа выданні партвыдавецтва ЦК ВКП(б) (на рускай мове)

МАРКС, К. Выбраныя творы ў двух томах. Пад рэд. В. В. Адарацкага. Том 1—2. Цана за абодва тамы 8 р. 50 к.

МАРКС, К. К крытыцы палітычнай эканоміі. Ц. у пер. 2 р. 50 к.

МАРКС, К., ЭНГЕЛЬС, Ф. Нямецкая ідэалогія. Ц. у пер. 5 р. 50 к.

ЭНГЕЛЬС. Ф. Людвіг Фейербах і канец нямецкай класічнай філасофіі. Ц. 50 к.

ЛЕНІН В. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм. Крытычныя заметкі аб адной рэакцыйнай філасофіі. Ц. у пер. 3 р. 25 к.

ЛЕНІН, В. І. Развіццё капіталізма ў Расіі. Ц. у пер. 3 р.

ЛЕНІН—СТАЛІН. Выбраныя творы ў адным томе. Ц. у пер. 6 р. 25 к.

СТАЛІН, І. Пытанні ленінізма. Выд. X. Ц. у пер. 3 р. 25 к.

ГУТАРКА ТАВАРЫША СТАЛІНА СА СТАРШЫНЁЙ АМЕРЫКАНСКАГА ГАЗЕТНАГА АБ'ЯДНАННЯ «СКРЫПС-ГОВАРД Н'ЮСПЕЙПЕРС», панам РОЙ ГОЎАРДАМ 1 сакавіка 1935 г. Ц. 10 к.

СТАЛІН, І. Марксізм і нацыянальна-каланіяльнае пытанне. Зборнік выбраных артыкулаў і прамоў. Ц. у пер. 2 р.

СТАЛІН, І. Прамова ў Крэмлёўскім палацы на выпуску акадэмікаў Чырвонай арміі 4 мая 1935 г. Ц. 10 к.

СТАЛІН, І. В. Прамова на першай усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў 17 лістапада 1935 г. Ц. 10 к. у пер. 30 к.

СТАЛІН, І. В. Прамова на нарадзе перадавых камбайнераў і камбайнерак 1 снежня 1935 г. Ц. 10 к.

Паштовыя заказы накіроўвайце па адрасу: Менск, Совецкая, 50, аддзяленне КОГІЗа.

ПАТРАБУЙЦЕ ВА УСІХ МАГАЗІНАХ

Заказы накіроўваць па адрасу: гор. Гомель, Нова-Беліца, кантора «Саюзмаргзбыт». Тэлефон 6-25, рахунак № 5.568.

ЛЕПШЫ АДПАЧЫНАК — ПАДАРОЖЖА ПА СССР.

У МЭТАХ АБМЕНУ ВЫТВОРЧЫМ ВОПЫТАМ, АЗНАЁМЛЕННЯ З ДАСЯГНЕННЯМІ Ў СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ І ДАСТАПРЫМЯЧАЛЬНАСЦЯМІ НАШАЙ КРАІНЫ,

АРГАНІЗАЦЫІ КУЛЬТУРНАГА АДПАЧЫНКУ,

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА УСЕСАЮЗНАГА ТАВАРЫСТВА ПРОЛЕТАРСКАГА ТУРЫЗМА І ЭКСКУРСІЙ арганізуе экскурсіі і падарожжы па СССР.

У 1936 г. АДКРЫТЫ НАСТУПНЫЯ МАРШРУТЫ:

КРЫМ, КАЎКАЗ, АЛТАЙ, ВОЛГА | БЕЛ. БАЛТ. КАНАЛ, ЗАПАЛЯР'Е, УКРАІНА, воз. СЕЛІГЕР | МАСКВА, ЛЕНІНГРАД, КУЗБАС, МІЧУРЫНСК

Ёсць маршруты ў Крым і на Каўказ з 10—20—30-дзённым прабываннем на адной базе.

Кожны працоўны можа набыць пуцёўку на любы маршрут у РАСТЭРМІНОЎКУ.

Працягласць пуцёвак ад 5 да 22 дзён.
Кошт пуцёвак ад 102 да 592 руб.
У кошт пуцёўкі ўключана поўнае абслугоўванне: харчаванне, памяшканне, культ. і экскурсійныя мерапрыемствы і ўнутрымаршрутны транспарт.

На маршруты Масква—Ленінград на ліпень пуцёўкі ўсе праданы.

Арганізацыі, жадаючыя забяспечыць сябе пуцёўкамі на экскурсіі і падарожжы па СССР, павінны неадкладна заключыць дагаворы.

Заключэнне дагавораў, даведкі і кансультацыі — у Беларускай канторы па запісу Цэнтральнага совета Усесаюзнага таварыства пролетарскага турызма і экскурсій.
Менск, рог вуліц Карла Маркса і Урыцкага, 11-16, тэл. 21-730.
Запросы пасылаць з аплочаным адказам.

Аб'ява аб рэгістрацыі

НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯТАМ ФІНАНСАЎ БССР,

на падставе палажэння і правіл аб дзяржаўнай рэгістрацыі (Зб. зак. і распараджэнняў урада СССР 1931 г. № 8, ст. 99 і бюлетэнь фінансавага і гаспадарчага законадаўства 1931 г., № 12),

3 мая 1936 года

зарэгістравана ў рэестры дзяржаўнай рэгістрацыі пад № 197-22

Беларуская Рэспубліканская кантора „ЗАГОТСЕНА".

Адрас: г. Менск, Совецкая, 46.

НАРКАМФІН БССР.

На падставе загаду па кіраўніцтву будаўніцтва аўтамагістралі Масква—Менск і Вяземлаг НКУС,

Жодзінская вузканакалейная чыгуначная ветка

КАНСЕРВУЕЦЦА.

Усе ўстановы і асобы, маючыя прэтэнзіі да Жодзінскай ветки, павінны іх прад'явіць да 15 мая 1936 г.

Пасля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

ЛІКВІДКОМ.

Друкарні „ЗВЯЗДЫ"

ПАТРЭБНЫ:

цынкаграфскі травільшчык,
вярстальшчыкі,
друкары на амерыканцы вучні-лінатыпісты,
кваліфікаваныя карэктары

Зварачацца: Совецкая, 63, другі паверх.

9 мая г. г., у 7 гадзін веч., у памяшканні клуба імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай)

АДБУДЗЕЦЦА чарговае пасяджэнне ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГОРСОВЕТА рабочых, калянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

ПАРАДАК ДНЯ:

Аб рабоце чыгуначнага вузла.

Білеты на пленум можна атрымаць у горсовеце (III паверх, пакой 49).

ПРЭЗІДЫУМ МЕНГОРСОВЕТА.

Трыкутнік трэста рэстаранаў і кафэ з глыбокім жалем паведамляе аб смерці дырэктара рэстарана „Еўропа"

ЛІЦІНСКАГА Аляксандра Аляксеевіча

ў дзень 7 мая пасля працяжной хваробы, і выказвае спачуванне яго сям'і.

Вынас цела—8 мая, у 5 г. вечара з Клінічнага гарадка.

Лагойскі РК КП(б)В з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці, паследаваўшай 7 мая 1936 г., у 9 г. 45 мінут раніцы, Ваенкома Лагойскага раёна, члена ВКП(б) з 1929 г.

МЕРГОЛЬДА Сямёна Аронавіча

і выказвае глыбокае спачуванне сям'і памёршага.

РК КП(б)Б.

Тыраж 90550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Уп. Галоўлітбела № Г—4758.